Анатоль Парэмбскі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Цімафей Хведашчэня ☞ I

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 48 (2742) Год LIII | Беласток, 30 лістапада 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Гэта такі момант пералому

З Паўлам ГЖЭСЕМ, аўтарам фатаграфічнага праекта „Маладыя мастакі", вылучаным у пятым выпуску конкурсу Samsung Art Master, сустракаемся ў час вернісажу 14 лістапада г.г. у Замку Уяздоўскіх у Варшаве.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Павел Гжэсь (год нар. — 1983) — беларус, жыве ў Гарадку на Беласточчыне, студэнт фатаграфіі ў Інстытуце творчай фатаграфіі Сілезкага ўніверсітэта ў Апаве (Чэхія). Дадаткова штудзіруе інфарматыку ў Варшаўскім політэхнічным інстытуце. У акадэмічным навучальным годзе 2003/2004 атрымаў стыпендыю ад Адукацыйнага аб'яднання „Відок" і Фонду „Адукацыя ў галіне прадпрымальніцтва". Аўтар мастацка-фатаграфічнага праекта „Меляшкі", з якім дэбютаваў у студзені 2008 года ў Галерэі „Белай" у Любліне.

Ганна КАНДРАЦЮК: — *Паўлік! Вельмі цешыць мяне Твой поспех і тое, што магу пабываць на Тваім вернісажы. Твой праект будуе метанарацыю ўсёй конкурснай выстаўкі. На ёй паказаны творы 14 маладых мастакоў. Ставіш крытычнае пытанне сітуацыі, у якой Ты сам апынуўся. Канкрэтна, дзевяць маладых мастакоў адказваюць на тваё пытанне: „Што ты зрабіў бы, каб Твае працы паказалі ў Цэнтры сучаснага мастацтва?"*

— Я паставіў такое пытанне, каб паказаць што думаюць маладыя мастакі пра падобныя ўстановы. І не ідзе тут пра канкрэтную галерэю, хутчэй пра культурны цэнтр, напрыклад, гэта можа быць самая прэстыжная галерэя ў рэгіёне. Я пытаю пра Цэнтр сучаснага мастацтва, бо ён мяне, як удзельніка конкурсу, датычыць. Мне ідзе пра адносіны між маладым мастаком і культурнай установай, у якой ён выстаўляецца і за якую адказнасць бярэ куратар. Для маладых гэтая справа вельмі складаная. Гэта такі момант пералому, пачатак уваходу ў нармальную сістэму мастацкай працы.

— *Кожны мастак хоча выстаўляцца ў прэстыжных месцах...*

— Аказваецца, не зусім так. Для адных гэта важная справа, для другіх не. І без гэтага яны будуць рабіць справу.

— *Наколькі адказы сваіх герояў лічыш шчырымі?*

— У пэўным сэнсе гэта такая ігра. Я адчуваю дыстанцыю герояў да майго пытання. Чалавек думае адно, скажа другое. Адказы маіх герояў паказваюць іх думкі. Тут бачым, што калі нехта мае дыстанцыю да самога сябе, тады адкажа жартам. Як само мастацтва, яно не бывае да канца шчырым, пазбаўленым гульні.

— *А для Цябе самога, якое значэнне мае сённяшняя выстаўка?*

— Сама ты бачыш!

— *Я бачу, але хачу ведаць як Ты гэта бачыш.*

— Гэта важны для мяне этап. Гэта мая першая выстаўка ў Варшаве і першая ў такой прэстыжнай установе ў Польшчы. Я — беларус, гэта для мяне вельмі важае, але мая нацыянальнасць не можа мяне абмяжоўваць. Важна, каб ствараць у тых рэаліях, у якіх я жыву. Думаю таксама, што разам з гэтай выстаўкай адчыняцца для мяне новыя перспектывы, з'явяцца думкі на будучыню.

— *Папраўдзе сутнасць Твайго праекта не ў пытанні „што Ты зрабіў бы...", толькі ў фотаілюстрацыі гэтага пытання. Хто прыдумваў позы і месцы для фатаграфій, ці Ты гаварыў ім што рабіць, як стаць, як апрануцца?*

— Гэта выглядала па-рознаму, у прынцыпе я стараюся „пабачыць", злавіць вобраз, які не прыстае да вядомых схемаў. Дзеля гэтага праекта я стараўся зрабіць такія здымкі, каб у іх адчувалася энергія месца і спосаб, у якія рэалізуюцца мастакі. Вядома, спачатку трэба пазнаёміцца з іх творчасцю, тады пашыраецца погляд на асобу.

— *За Тваімі плячыма бачым (на здымку — Г. К.)...*

— Гэта фатограф з Катавіцаў. Здымак зроблены ў квартале Нікішовец, з якога вырастаюць праекты майго героя. Гэта квартал абцяжараны чорнай славай, вечарам там лепш не выходзіць самому на вуліцу...

— *На Тваіх інтэрнэт-сайтах пішуць, што найперш гіпнатызуеш сваіх герояў, таму яны так шчыра глядзяць ў Твой аб'ектыў! А тут бачым другое, кожны глядзіць дзе яму падабаецца...*

— Твой тэкст датычыць іншага праекта! Я стараюся заранёў не вырашаць як мае быць канчаткова. Ніколі не выйдзе на сто працэнтаў так як прыдумаеш... Напэўна пазбягаю штучных сцэнарыяў. Калі фатаграфую, стараюся, каб адносіны паміж мной і георояміі былі партнёрскімі. Хачу, каб мой герой адчуў, што стаўлюся да яго з пашанай. Мяне не цікавіць пагоня за сенсацыяй...

— *Скажы, ці сярод адказаў, якія прыдумалі маладыя мастакі, нехта Цябе здзівіў?*

— Не! Але кожны адказ дадае штосці „іншае" да цэлага праекта.

PS. Сярод лаўрэатаў згаданага конкурсу — Аляксандра Чарняўская, родам з Беластока (дыплом абараніла ў майстэрні Лявона Тарасэвіча ў верасні 2008 г.). Аляксандра Чарняўская ўзнагароджаная за цыкл карцін пад загалоўкам „У вёсцы", на якіх распазнаем ваенна-трагічныя здарэнні падляшска-праваслаўнай вёскі.

Вытанчаны фальш

Не аднойчы было сказана і напісана, што вельмі моцны ўплыў на свядомасць беларусаў сёння робіць расійская тэлевізійная прастора. Гэтыя нататкі пішуцца адразу пасля прагляду новай мастацкай кінастужкі вядомага расійскага рэжысёра Мікіты Міхалкова пад прэтэнцыёзнай назвай „Дванаццаць". Знешне фільм пра суд прысяжных і псіхалогію людзей. Насамрэч гэта толькі на пярэднім плане, а вось галоўная сутнасць прыхавана.

Таленавіты мастак кіно Міхалкоў сфальшывіў у гэтай стужцы неаднаразова. Першы раз, калі вывеў персанажа (у фільме пра яго толькі гаворыцца) — адстаўнога расійскага афіцэра, выратавальніка, які ўсынавіў чачэнскага хлопчыка, бацькоў якога забілі падчас расійска-чачэнскай вайны. Выразна яшчэ раз, калі ўзяў сабе любімаму ролю найбольш маральнага персанажа стужкі, старшыні суда прысяжных, гэткага незвычайнага альтруіста. І не проста альтруіста, але ізноў афіцэра, на гэты раз ветэрана спецслужбаў. Чачэнская вайна ў фільме падаецца толькі фонам, але падаецца нібы як грамадзянская, а рускія афіцэры — гэта сапраўдныя міратворцы і гуманісты з вялікай літары. Так што галоўны ідэалагічны падтэкст фільма — гэта ўслаўленне расійскага афіцэра, апалогія сённяшняга пуцінізму. Робіць гэта Міхалкоў (які ў сваім асабістым жыцці і дзейнасці злаўчыўся спалучыць погляды перакананага манархіста і асабістае сяброўства з сённяшнім рэжымам, ідэйныя бацькі якога і знішчылі расійскую манархію) надзвычай хітра. Выкарыстоўваючы свае прафесійныя навыкі і талент сабраных акцёраў — партыя кожнага асобнага з іх сапраўды вартая шчырага захаплення. Сутнасць сваю, аднак, Міхалкоў выдаў і канцоўкай гэтага фільма (нібыта гуманістычнага па форме, але шкоднага сваёй вытанчанай фальшывасцю) і наступнай сваёй дакументальнай агіткай таксама з лічбавай назвай „55", выпушчанай адмыслова да дня нараджэння любімага правадыра Уладзіміра Пуціна.

У суседзяў зараз вельмі папулярны тэлевізійны праект „Имя России". Па выніках народнага галасавання штотыдзень абмяркоўваюцца гістарычныя постаці, якія складаюць ці могуць складаць гонар гэтай краіны. Сярод тузіна імёнаў-фіналістаў такія асобы як Іван Грозны, Пётр І, Кацярына ІІ, Аляксандр Суворaў, Уладзімір Ленін, Іосіф Сталін. Астатнія таксама далёка не анёлы (нейкім цудам у спіс трапіў толькі Фёдар Дастаеўскі), але палова — гэта ўвогуле крывавыя маньякі, тыраны і забойцы соцень тысяч і нават мільёнаў нявінных людзей. І іх выбіраюць за гонар нацыі! Іх славяць у дваццаць першым стагоддзі! Дзе ўжо там месца Аляксандру Герцану і Льву Талстому, Аляксандру Салжаніцыну і тым больш Андрэю Сахараву!?

Уяўляю, як прыблізна магла выглядаць наша нацыянальная дванаццатка: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, князь Вітаўт, Кастусь Астрожскі, Францішак Скарына, Леў Сапега, Кастусь Каліноўскі, Максім Багдановіч, Адам Станкевіч, Янка Купала, Ларыса Геніюш, Васіль Быкаў... Але калі праводзіць усенародны плебісцыт, то напэўна пасярод названых постацей з'явяцца і Пётр Машэраў з Аляксандрам Лукашэнкам і тыя ж Ленін са Сталіным. Культ Сталіна пачалі адраджаць якраз у Беларусі, а зараз гэты працэс ідзе на бяскрайніх расійскіх прасторах. І не дзіва, што ні сённяшняе расійскае кіраўніцтва, ні расійская грамадскасць не хочуць прызнаваць факт Галадамору на Украіне як этнацыд. Дзмітрый Мядзведзеў быў запрошаны ў Кіеў на памятныя мерапрыемствы, але, канешне ж, не паехаў. І сутнасць тут зусім не ў складаных расійска-ўкраінскіх міжнацыянальных дачыненнях. Крэмль папросту не хоча прызнаваць Галадамору ні этнацыдам, ні генацыдам. Бо сённяшняе маскоўскае кіраўніцтва — гэта духоўныя дзеці і прадаўжальнікі жахлівай справы Леніна-Сталіна. Іхныя „капыты" і „хвасты" так і вылазяць з-пад парадных касцюмаў і знешняга глянцу. Працэс пакаяння, які разгортваўся на пачатку перабудовы і квола ішоў у ельцынаўскі час, даўно згорнуты. Больш таго — ён скіраваны ў адваротны бок. Мастацтва ж мусіць абслугоўваць новую (а насамрэч злавесную старую) ідэалогію. Таму і з'яўляюцца такія вытанчаныя фальшывасці як фільм Міхалкова „Дванаццаць", які зараз хочуць выпхнуць на „Оскара". І які, зразумела, раю абавязкова паглядзець.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Юбілей паводле патрэб

Што было галоўнай медыйнай падзеяй у нашай краіне ў мінаючым лістападзе, мабыць, нават складана разабрацца. Калі з гэтай тэмы зняць амерыканскія прэзідэнцкія выбары, сусветнае зацікаўленне да якіх не абмінула і нашай краіны, тады на галоўным месцы краёвых перадавіц астанецца бадай прэзідэнцкі парадны прыём, наладжаны 11 лістапада. З гэтай прычыны ў нашых медыях узнікла такая катавасія, што, на добрую справу, не надта вядома, чаму тая парадная ўрачыстасць была прысвечана. Афіцыйна быццам ішло пра ўшанаванне гадавіны вяртання ў Польшчу незалежнасці, але пра гэта ў публічнай прасторы было мала, а найбольш было пра цяперашнія палітычныя тусоўкі; гісторыя была сюды заклікана толькі ў якасці фігавага лістка.

Але калі б усур'ёз пацікавіцца ў звычайнага жыхара Польшчы, што ён ведае пра падзеі 90-гадовай даўнасці, мяркую, што вынік быў бы надта мізэрны. Аднак 11 лістапада 1918 года заслугоўвае на больш увагі. Галоўнай падзеяй таго дня было завяршэнне першай сусветнай вайны, якая прынесла смерць каля васьмі з паловай мільёнам людзей. Але вайна тая завяршылася толькі на захадзе Еўропы, на ўсходзе нашага мацерыка яна ў той час набірала размаху, забіраючы за сабою на той свет чарговыя мільёны, а крыху пазней чарговыя (напр., Галадамор) і чарговыя (напр., яжоўшчына).

Першая сусветная вайна пакінула бадай найбольшы след у нашым краявідзе за ўсю пісаную гісторыю. Яна разбурыла мясцовы лад жыцця, забрала з гэтага свету сотні тысяч жыхароў нашай тутэйшай малой айчыны. Загінулі яны не на палях ваенных змаганняў, але ў „мірнай" сумятні, якую прыпаднеслі ім улады іхняй тагачаснай дзяржавы. Здаецца мне, што тутэйшыя людзі прыгадвалі тыя падзеі, але толькі ў выглядзе адзіночных эпізодаў, не падводзячы іх сінтэзу. Калі прыгадаць час маёй адукацыі, дык тады і навучанне пра тую эпоху зводзілася галоўным чынам да бальшавіцкага перавароту 1917 года ў Расіі, да ўсхвальвання, якое тады здарылася чалавецтву шчасце. Ды і гаротнага свайго жыцця ў той, як цяпер называецца, міжваенны час нашы землякі не асацыявалі з загадамі ваеннага кіраўніцтва „сваёй" царскай імперыі, якое выдварыла нашых людзей у шматгадовае бадзянне па чужыне, а толькі з дзяржавай, у якой давялося ім жыць пазней.

Ды не адны „тутэйшыя" любяць павінаваціць Польшчу за свае крыўды. Час ад часу з'яўляюцца ў нашых медыях весткі пра захады Эрыкі Штэйнбах, якая хадайнічае па ўсім свеце за кампенсацыяй польскімі ўладамі крыўдаў, якія пацярпелі нямецкія бежанцы з канца другой сусветнай вайны. Але яе хіба ў тым, што і яна, як і шмат якія нашы людзі, „забыла", што бежанства немцаў было закамандавана нямецкім ваенным кіраўніцтвам. Не прабіваецца ў свядомасць, што „свае" ўлады так жорстка абышліся з насельніцтвам.

Прыклад Эрыкі Штэйнбах скарыстаю для прадстаўлення іншай праблемы: за кампенсацыяй за крыўды перыяду першай сусветнай вайны мог бы нехта ад нас, нашчадкаў нашых бежанцаў, хадайнічаць у віноўнікаў тых крыўд. Вядома ж, што загад царскіх чыноўнікаў абвяшчала тут духавенства, падпарадкаванае структурам Расійскай праваслаўнай царквы. Абыду я гэтую Царкву бокам, бо ўяўляю сабе, якую мой прамы ход можа выклікаць збянтэжанасць нашых артадоксных вернікаў, а толькі гляну ў бок афіцыйных вярхоў цяперашняй расійскай дзяржавы. Здаўна вядома, што „Москва слезам не верит", ды і зараз тамашні прэзідэнт Мядзведзеў рэзка адмовіўся ад ушанавання ахвяр згаданага мною Галадамору на Украіне...

Нечаму дзівавацца, кожныя граблі грабуць у свой бок, а Маскву, сталіцу „новых рускіх", нават не выпадае ставіць недзе збоку. Бо калі прызнацца віноўным, трэба было б неяк расплаціцца за тую віну. Ці ж выпадае так рабіць першасідзецелю грамадства, якое прывучана абажаць толькі герояў? А герой нікому і ніколі не здаецца...

Вось і мая тэарэтычная праблема астаецца толькі на паперы, а аматару нейкай справядлівасці, заміж траціць час на пройгрышныя гістарычна-юрыдычныя валакіты, лепш выгадна паглядзець на гульбішчы нашых герояў. І не трэба хваляваццa, з якой тое гулянне нагоды — 11 лістапада можа быць юбілеем любой гістарычнай падзеі. У той дзень у 1961 годзе Молатаў, Маляткоў і Кагановіч былі выдвараны з савецкай кампартыі, у 1860 годзе ў Буэнас-Айрэсе яўрэі згулялі першае сваё тамашняе вяселле, у 1790 годзе ў Вялікабрытанію былі завезены першыя кітайскія хрызантэмы, у 1821 годзе нарадзіўся Фёдар Дастаеўскі, у 1965 годзе Кэсьюс Клей накаўтаваў Флойда Патэрсана, а ў 1982 годзе Лех Валэнса выйшаў з інтэрнавання на свабоду. А калі каму не падабаецца Лех Валэнса, той можа адзначаць толькі гадавіну незалежнасці Польшчы.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Прыступка дваццаць сёмая?

„Спакой цела з'яўляецца станам упарадкавання спосабу жыцця і сцішання жарсцяў. Спакой — гэта апанаванне думак і ўнутраная непахіснасць. (...) Пачатак унутранага спакою гэта аддаленне ўсякай мітусні, якая ўводзіць замяшанне ўглыб душы. Канчатковы яе пункт — пазбыцца страху перад абліччам усіх замяшанняў і застацца пасярод іх непахісным". На такія думкі св. Іаана Лесвічніка натрапіў я зараз перад тым, як нядаўна паехаў на праваслаўны могільнік на варшаўскай Волі. Развітваўся там з адной з апошніх найбольш блізкіх мне асоб. Якраз на гэтай некраполіі стаіць царква, вось, св. Іаана Лесвічніка, сінайскага аскета, аўтара „Лесвіцы да неба", у якой апісаў дарогу духовага развіцця. Паасобныя прыступкі вызначаюць: змаганне з заганамі, апанаванне думак, вызваленне ад турбот і патрэб і г.д. Прыведзеная думка, а папраўдзе вырваныя мною яе фрагменты, датычаць прыступкі 27-й: „Аб унутраным спакоі цела і душы".

На вольскім могільніку, ідучы на „маю" магілу, я праходзіў каля па-мастацку цудоўных намагільных каменяў тэолага а. праф. Юрыя Клінгера, караля цыганоў Рудольфа Квека, прэзідэнта Варшавы з XIX стагоддзя Сакрата Старынкевіча ці сямейнага маўзалея Гудзаватых, сям'і сучаснага бізнесмена. Магіла блізкай мне асобы, у параўнанні да некаторых надмагілляў, надзвычай сціплая. Гэта мармуровая пліта ў дзвюх трэціх накрытая мармуровым дашком.

Адзінаццаць гадоў невядома было, што з маім блізкім адбываецца. Незалежна ад паведамлення аб загінуўшым, ані пракуратура, ані паліцыя не выказаліся спраўнасцю ў пошуках. У тым часе прапалі акты, дакументы, даследаванні ДНК, пазмяняліся чыноўнікі і функцыянеры. Пасля шматлікіх інтэрвенцый урэшце, адзінаццаць месяцаў таму, стала вядомым, што ён не жыве. Паліцыя аднак не ўмела ўказаць, дзе пахавана цела. Месяцамі працягваліся пошукі месца пахавання. Пасля чарговых інтэрвенцый, да таго на найвышэйшым узроўні, аказалася, што пахавалі яго на адным з варшаўскіх могільнікаў як NN. Цела было эксгумавана і перанесена якраз на вольскі могільнік, адпаведны ягонаму веравызнанню. Дагэтуль, аднак, не былі высветлены прычыны смерці і дэталі яе акалічнасці. Ніхто рацыянальна не вытлумачыўся са шматлікіх адмаўленняў у дзеяннях паліцыі. Гэта аднак нішто пры тым, што я і іншыя блізкія ўсё не маем стопрацэнтнай упэўненасці, што той NN гэта не хто іншы.

Пасля паховін я на таксі паехаў у цэнтр Варшавы на жалобную сустрэчу ў вельмі прыватнай кампаніі. А ў Варшаве неверагодныя вулічныя коркі. Да таго таксіст рабіў усё, каб тыя коркі абмінуць, значыць, ехаў г.зв. „крутой" дарогай. Не было ні хутчэй, ні танней. Пасля гэтай урачыстасці я рашыў наведаць адну знаёмую. Рушыў у Вілянаў на гарадскім аўтобусе. Глянуў на расклад: знакаміта, аўтобус зараз будзе — падумаў. Не было. Чарговага, які меў прыехаць згодна з распіскай, таксама не было. Забраўся на трэцім, праз больш чым гадзіну чакання на марозным ветры. Дзень пасля паховін трапіў я ў Сейм. Было асабліва горача; вельмі шмат дзеялася. У залах пасяджэнняў сеймавых камісій спрэчкі і таўкатня, на калідоры нервовыя пошукі журналістамі ньюсаў, гонка дэпутатаў за медыйным іміджам; каму ўдасца стаць перад тэлекамерай, той лепшы.

У таксоўцы, чакаючы аўтобуса і ў Сейме, у гэтым замяшанні я нейк застаўся непахісным. Ці мо я, прыводзячы тут словы святога Іаана Лесвічніка, „у кватэры цела стараўся ахапіць рэчы нецялесныя?" Ці не была тут падказка: маю стацца ісіхастам — тым, хто кіруецца да ўнутранага спакою і засяроджання?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Рады і гмінныя ўлады!

Хвалі лёсу Анатоля Парэмбскага

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

— Сабраны тут вершы, якія былі пісаны пераважна добры кавалак часу, — сціпла трымаў у руках вялікі зборнік лірыкі аўтар з Валіл-Станцыі Анатоль Парэмбскі. Кніга выйшла пад юбілей дзядзькі Анатоля (85-годдзе). Першымі ўбачылі яе госці гарадоцкага маёвага свята — дзесяцігоддзя хору „Асенні ліст" і свята пенсіянераў, калі і Анатоль Парэмбскі быў адзначаны як юбіляр і грамадскі дзеяч. Першыя яшчэ цёплую кнігу атрымалі сябры Анатоля Парэмбскага з літаратурнай групы „Каласы". І аж у зазімак Гарадок, дзякуючы тутэйшым літаратарам, 8 лістапада сарганізаваў яму адпаведны літаратурны вечар, у вялікай кіназале Дома культуры імя Кастуся Каліноўскага, які ў апошнія часы набыў паспалітую назву Гміннага асяродка культуры. Кастусёвае імя прагучыць у гэты дзень некалькі разоў. Па-першае, з размаху клічуць правадыра каласоўцаў Кастуся Казлоўскага „Кастусём Каліноўскім" і, каб не ягоны талент таксама і арганізатарскі, і не напорыстасць празаіка-мацука сярод племя гмінных і шырэй вядомых паэтаў розных пакаленняў, што яднаюцца ў мастакоўскую групу, якая і ўмее выступіць на сцэне, дык невядома ці і мафусаіл сярод гарадоцкіх творцаў дастаў бы свае вершы з шуфляды. А земляроб да гэтай пары, родам са Страшава, шчупленькі дзядзька з вуліцы Лісяй, які косіць і вяжа ці не самыя спраўныя снапы ва ўсёй Беласточчыне, наўрад ці разам з усімі ўскараскаўся б на сцэну з новымі творамі!

— Бо трэба тое, што пішам, паказаць! — скажа Кастусь Казлоўскі з вялікай сцэны, дзе сядуць разам з паэтам за столікам, пры паэтычнай лямпе і збанку з асенняй ружай. Мушу прызнацца, што размова, якую вёў Кастусь Казлоўскі, аматар літаратуры, па вельмі спраўна падрыхтаваным ім самім сцэнарыі, інтэлігентна рэагуючы на неспадзяваны ход жывой гутаркі з неардынарным і дасціпным чалавекам, варта была шырэйшай чым гмінная сцэны. А і пажылы аўтар, што быццам нарадзіўся для таго, каб выступаць перад большай публікай, а тая трымалася ў свойскай, сямейнай атмасферы, спрычыніўся да таго, што некароткая прэзентацыя была займальнай і застаўся ў душы слухачоў прысмак добра праведзенай бяседы сярод сваякоў, якіх быццам бы ведалі даўно, бачыліся толькі подбегам, а тут сапраўды парадніліся, пачаставаліся, нагаварыліся. І ўсе разам — і старэйшыя, і маладыя сваякі. Бо запрошаны быў на сцэну гурт меншых і большых сяброў гарадоцкай „Казкі". Дзеткі з пачатковай школы і гімназіі ахвотна выступілі з дэкламацыяй вершаў пра і ім блізкую родную старонку, і праспявалі пару песень са свайго рэпертуару. Сябры спадара Анатоля з мастацкага, можна сказаць мультымедыйнага гурту „Каласы" дадалі свае падарункі-выступленні, даказваючы, што яго творчасць жыве ў розных відах мастацтва. Янка Карповіч і Галіна Сянкевіч спявалі песні на ягоныя словы, Ніна Цыванюк, Галінка Ляховіч і Марыя Врублеўская спявалі і дэкламавалі прысвечаныя яму шчырыя вершы. Прагучалі словы, якія выклікалі вялікае хваляванне ў слухачоў, бо якія ж блізкія па духу ўсе сябры „Каласоў", хоць пішуць на розных мовах! Сустрэча, дарэчы, і іх разварушыла, змабілізавала, бо ў апошні час, як успомніў Янка Грыцук, здавалася, што ім ужо палу не хапала. Таму перш за ўсё схапіліся сарганізаваць аўтарскую сустрэчу сябру Анатолю Парэмбскаму, да таго не ў нейкай ціхай камернай залцы, а на вялікай сцэне дома культуры Кастуся Каліноўскага, і прыём-бяседу пасля сарганізавалі для ўсіх удзельнікаў вечара. Варта, вось, было б, каб і гмінныя ўлады больш падтрымалі сваіх сціплых і заўзятых ратаяў культуры на чале з Кастусём „Каліноўскім"-Казлоўскім ды Анатолем Парэмбскім.

— Калі гаворка пра Каліноўскага... — успамінае дзядзька Анатоль, — дык мы рабілі поле Каліноўскіх. У 1937 годзе тата ўзяў пазыку ў Касе Стэфчыка на 30 гадоў сплаты ды набыў большую частку маёнтка Каліноўскіх у Мастаўлянах. Мы пераселіліся туды са Страшава. Тата меў вялікую бібліятэку. Я хадзіў у беларускую школу. Першыя мае вершы я напісаў у Мастаўлянах. Мой дэбют адбыўся 22 чэрвеня 1941 года ў „Піянеры Беларусі".

Першыя допісы маладога мастаўлянца Анатоля Парэмбскага ў „Ніву" паявіліся ўжо ў 1956 годзе. Ды вершы трапілі на яе старонкі зусім нядаўна, хоць пісаліся ўвесь час. Пра што пішацца найбольш?

— Пажыў чалавек, ёсць пра што думаць, успамінаць. Пра родную старонку, найбліжэйшае. *Мы тут жылі і жывем, Гарадок славім песняй і чынам. Паклон сёння ўсім аддаем, хто нам багаціць айчыну. Культуры хто зруб збудаваў, хто цэрквы ўзнёс на вышыны, хто песняй душу займаў — гарадоцкія нашы жанчыны. І тым, што на станцыю ішлі даехаць да працы, навукі, што ад працы на вёсцы, раллі пакруціла ім ногі і рукі.*

— У Вашых вершах усхваляеце звычайных, працавітых людзей, успамінаеце пра далейшае, гістарычнае мінулае Гарадка, і людзей, якія натхнялі і натхняюць іншых. Як тыя жанчыны з „Расспяванага Гарадка" ці „Асенняга ліста". І таго, хто збудаваў сімвал цяперашняга Гарадка.

— Адкажу вершам „Ты кланіўся кругом".

Ты кланіўся кругом,
абы есць, абы жыць,
На прылбе ці звязда,
на прылбе ці крыжы.
Хто пайшоў за крыжом
і стаў атеп казаць,
Стаў для маці вужом,
забыў як маму зваць.
Хто пайшоў за звяздой,
той вярнуўся да хат,
Б'е паклон у царкве,
а такіх у нас шмат.
Ты цяпер не кажы —
„Гарадок-камуніст"!
Не з'язычыў яго нават
сам антыхрыст!
Калі д'ябал вёў прым,
дыхаць не было чым,
Гарадок будаваў святыню
з-над святынь!
З палавінак цаглін
мужыкоў цэлы шнур
Клалі так як маглі,
абы толькі рос мур.
Ты цяпер паглядзі
— твой красуецца труд.
Як не верыш — пайдзі
— глянь як моліцца люд.
Хто нас духам натхнуў,
хто нам даў столькі сіл:
Няхай вечна жыве наш
Вялікі Васіль!

Анатоль Парэмбскі, бацька чатырох сыноў, хоць у гадах, сам не кідае роднай зямелькі. Хоць знойдзе час і на свята (ці не найбольш наробіцца са сваёй жонкай Марыяй перад рознымі гарадоцкімі „Бяседамі" і „Днямі"), працуе ў полі, гадуе кароў.

— От, думала, піша, дык хай піша, ці ж яму забароніш, — усміхаецца жонка. — З гэтага ж есці не будзеш хлеба. Раптам замане — сядае, занатоўве свае думкі, што ў галаве складваюцца. Нядаўна сын Раман кажа: „Мама, тата сярод ночы ўстаў, чуеш, тупае, ходзіць, думае. Верш яму скадваецца!" Міла, што ўшанавалі ягоны труд.

Кнігу памог выдаць бацьку Анатолю сын Міраслаў, які пражывае ў Холме. Сам яе эдытарска афармій, ілюстрацыі дала Марыя Мялешка.

— Я сабраў частку татавых вершаў, сам упісаў іх у камп'ютар. Можа, дзе і памылкі ёсць, — кажа Міраслаў Парэмбскі. — Я беларускай мове ў школе не вучыўся. Адукацыя ў мяне тэхнічная. Ды хоць такім чынам дакладу сваю цаглінку да нашай культуры.

Кастусь Казлоўскі, Марыя і Анатоль Парэмбскія ды Ніна Цыванюк

Анатоль Парэмбскі з маладой „Казкай" на аўтарскай сустрэчы

Куды дарога?

Пра тое, што войт Міхалоўскай гміны Марк Назарка добра дбае пра само Міхалова, няма што і гаварыць ці хваліць яго — дастаткова паглядзець як за мінулыя гады яно змянілася. Змяніліся ўсе вуліцы, ляжыць на ўсіх асфальтавае палатно, побач тратуары, харошыя пачатковая школа і гімназія. Сёлета разлілі вадасховішча, пабудавалі амфітэатр. З наступнага года Міхалова стане горадам, яно выканала ўсе крытэрыі каб ім быць.

Летам давялося мне гутарыць з чалавекам з вёскі Гозна Міхалоўскай гміны, які сказаў мне, што войт падрэзвае галіну, на якой сам сядзіць. Паабяцаў быў ён жыхарам Патокі і Гознай пакласці на дарозе з Геранімова ў Патоку і Гозну асфальтавае палатно і паправіць брук у вёсках, што яго паруйнавалі падчас пракладкі водаправода, і на той брук таксама пакласці асфальт. Войт адмяніў з пасады солтыса вёскі Гозна Сяргея Ляшчынскага, а саму вёску падпарадкаваў солтысу Патокі. Гэты гознянец заявіў, што пры наступных выбарах у самаўрады звернецца да былога контркандыдата цяперашняга войта, Яўгена Семенюка з Новай Волі, каб той кандыдаваў у наступных выбарах ужо на пасаду бурмістра горада Міхалова, дык тады ўсе пойдуць на яго галасаваць!

Гэта магло б значыць, што дарога можа памяняць войта ў гміне!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Парады дзеда Міколы

Як прагнаць шуляка

Калі каршун, шуляк ці ястраб — па-рознаму называюць гэтую драпежную птушку па нашых вёсках — крадзе ў гаспадарцы курэй, трэба спрабаваць напалохаць яго пудзілам. „Страх" найлепш выканаць у форме чорнага птаха з чырвонай галавой. Тады каршун будзе здалёк абмінаць нашу гаспадарку, бо будзе яму здавацца, што на калку вісіць птах з падрэзанай шыяй і цячэ з яго кроў, а каршун баіцца крыві.

(мл)

Вокам з Патокі

Я згэтуль

Я нарадзіўся ў Патоцы,
Там ад дзяцінства ўзрастаў.
Ці хто з суседзяў мог прадбачыць,
Што я настаўнікам, вось, стаў?
Цяжкім было маё дзяцінства.
У полі трэба памагаць,
І каб ралля наша радзіла,
Яе я мусіў узараць,
Засеяць збожжа на ўсім полі,
Каб послей мог яго збіраць...
— Сынок, — казала мая мама, —
Цяжка ж табе сілы сабраць!
Быў я тады такі маленькі,
А тут пара вось рассяваць.
Сусед памог мне сеяць збожжа,
А я яму — баранаваць...
Так я да старасці дажыўся.
Пакінуў вёску назаўсёды,
З сям'ёй у горад пасяліўся,
У кватэры маю ўсе выгоды:
Вада ў хаце цячэ із крана,
Не трэба печы распаляць.
Позна ці рана я ўстану,
Магу й да поўдня паляжаць...
Аднак мне сніцца мая вёска.
Я не магу яе забыць.
Бо так як тую акаліцу
Другой не зможаш палюбіць.

Мікола КРАЎЧУК

Гайнаўскія сустрэчы школьнікаў

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У Гайнаўцы навучанне беларускай мовы вядзецца ў розных школах і каб наймалодшыя дзеткі трапілі на заняткі роднай мовы, трэба пераканаць іх бацькоў, каб запісалі сваіх малышоў на дадатковыя ўрокі — тры гадзіны ў тыдзень. Каб пераканаць бацькоў да патрыятычнага ўздыму, настаўнікам беларускай мовы трэба весці свае заняткі вельмі займальна, прыдумваць розныя гульні і арганізаваць экскурсіі, якіх менш на іншых прадметах. Весткі аб характары ўрокаў беларускай мовы, аб пазакласных сустрэчах, выездах на конкурсы або сустрэчы дзетак, якія вучацца па-беларуску, хутка разыходзяцца паміж вучнямі і даходзяць да бацькоў. Аднак адным з самых лепшых спосабаў, каб пераканаць нерашучых бацькоў запісаць дзетак на ўрокі беларускай мовы, з'яўляюцца школьныя вечарыны, у час якіх дзеткі і моладзь паказваюць на роднай мове свае тэатральныя і музычныя здольнасці. Зараз у гайнаўскіх школах на заняткі беларускай мовы запісваюцца не толькі першакласнікі або другакласнікі, але і вучні старэйшых класаў падставовай школы ды гімназісты, захвочаныя нагаворамі сваіх сяброў або тыя, што хочуць пазней паступаць у Гайнаўскі белліцэй.

Добрай нагодай, каб выступіць на беларускай мове перад бацькамі і шырэйшай публікай сталі Мастацкія сустрэчы школьнікаў, якія ладзіць Ян Карчэўскі, настаўнік беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя і заадно намеснік старшыні ўправы аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" (афіцыйныя арганізатары мерапрыемства — дырэкцыя Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы і ўправа музейнага аб'яднання).

Зацікаўленне выступленнямі вучняў на V Мастацкіх сустрэчах школьнікаў, што адбыліся 16 лістапада ў Беларускім музеі, было вялікае, а сядзячыя месцы ў кіназале хутка запоўніліся і частцы гайнавян прыйшлося стоячы глядзець выступы школьнікаў.

Паказалі ўмеласці і здольнасці

Сёлетнія сустрэчы школьнікаў распачаліся з танцаў. Калектыў „Крынічка" з Падставовай школы № 6, якім апякуецца настаўніца беларускай мовы Беата Кендысь, запрэзентаваў пад народны стыль танец да песні „Цячэ вада ў ярок".

— Мы спецыяльна перад мастацкімі сустрэчамі заснавалі ў школе танцавальны калектыў „Крынічка" і развучылі танец. Дзеткам гэта спадабалася і хочуць вучыцца народным і іншым танцам ды выступаць перад публікай, — спадарыня Беата Кендысь толькі пацвярджае, што мастацкія сустрэчы становяцца інспірацыяй для пазакласнай дзейнасці. Паведамляе яна, што колькасць вучняў, якія ходзяць на заняткі беларускай мовы ў Комплексе школ № 3, у які уваходзіць ПШ № 6, прыблізная да той з мінулых гадоў і падыходзіць пад 200 асоб.

З гэтай жа школы з вершыкам выступіла Магда Гаўрылюк. Іншыя вучні „шасцёркі" многа напрацаваліся рыхтуючы пад наглядам настаўніцы беларускай мовы Людмілы Грыгарук лялечны спектакль „Каза-манюка" і рэквізіты да яго.

З доўгай праграмай выступілі вучні з невялічкай гайнаўскай „тройкі"

— З гэтай пастаноўкай мы выступалі ўжо ў час Свята беларускай культуры, якое ладзім у нашай школе і лялечны тэатр нашым дзеткам спадабаўся, — кажа настаўніца Людміла Грыгарук.

— Рэквізіты дапамагалі нам выканаць бацькі, але такія гульні нам падабаюцца, — рашуча заяўляюць дзяўчаткі з „шасцёркі". Іх выступы розніліся ад іншых сваёй непаўторнасцю.

У мінулых гадах вучні невялічкай гайнаўскай „тройкі" выступалі з доўгімі, цікава падрыхтаванымі і дапрацаванымі пастаноўкамі. Сёлета аддалі перавагу спевам, карацейшым пастаноўкам да песень і танцам, якія ў цэлым таксама занялі многа часу. Дзеткі, рыхтуючыся пад кірункам Марыі Крук, арыгінальна паказалі інсцэніроўкі да песень „Ай, мама, мама..." і „Шэры кот".

— У нашай школе толькі адзінкі не ходзяць на заняткі беларускай мовы і можна сказаць, што з другога класа (тады распачынаецца ў гэтай школе вывучэнне роднай мовы — А. М.) вучоба беларускай мове паўсюдная, — заяўляе настаўніца беларускай мовы Марыя Крук. — Аднак увесь час трэба разнародна весці заняткі, каб вучняў трымаць у напружанасці.

Тэатр „Лясныя сябры" Комплексу школ № 2 з інтэграцыйнымі аддзяленнямі (вядомага ў Гайнаўцы як „двойка") пад апекай Евы Анішчук падрыхтаваў цікавую інсцэніроўку „Муха-пяюха". З дэкламацыяй выступілі вучні падставовай школы № 5 — Вераніка Каценцкая, Дамініка Дубіцкая, Наталля Самоцюк, Матэвуш Гаўрылюк, Аляксандра Якімюк і Барташ Плева, які прадэкламаваў на патрыятычны верш „Я беларус", а да дэкламацыі вучняў рыхтавала настаўніца беларускай мовы Аліна Новік. Хаця публіку найхутчэй зварушыць і зацікавіць умела падрыхтаванымі пастаноўкамі, песнямі ці танцамі, дэкламацыя вершаў і прозы таксама патрэбная, асабліва калі з творамі выступаюць вучні, якія ўмеюць дэкламаваць на высокім узроўні, а ў выпадку наймалодшых дзетак найважнейшыя іх ангажаванасць у дэкламацыю і адвага паказацца перад публікай. Хаця ў апошніх дзвюх школах менш вучняў ходзіць на заняткі беларускай мовы, можна гэта памяняць, калі з дапамогай настаўніцам прыйдуць бацькі.

З дэкламацыяй рашыліся выступіць таксама белгімназіст Пётр Герасімюк і белліцэіст Пётр Давідзюк, а іншыя белліцэісты аддалі перавагу музычным формам. Сабраныя маглі паслухаць гітарны міні-канцэрт у выкананні Пятра Петручука, які, між іншым, выканаў песню „Простыя словы" і дуэт Данеля Юрчука і Пятра Пякарскага, якія, між іншым, заспявалі песню „Тры чарапахі". Перад публікай выступіў таксама бацька аднаго з вучняў, выпускнік Гайнаўскага белліцэя яшчэ з васьмідзесятых гадоў, вядомы ў свой час як „вучань з гітарай". Як відаць, пасля дваццаці гадоў не адставіў ён гітары ў куток, а яго музычны талент унаследаваў сын Пятро Петручук, які выступіў раней.

— Я рашыўся заспяваць песні Данчыка з маіх школьных гадоў, — заявіў Аляксандр Петручук. — Канешне, не абышлося без „Спадчыны".

Галоўны арганізатар мерапрыемства і заадно яго вядучы Ян Карчэўскі быў рады, што мерапрыемства мацнее.

— Здзяйсняецца ідэя пастаяннай прэзентацыі здольнасцей і ўмеласцей вучняў перад бацькамі і шырэйшай публікай, што дае магчымасць паказаць працу дзетак і моладзі, а таксама і настаўнікаў, якія ў час пазакласных і бясплатных заняткаў многа робяць для распаўсюджання беларускай культуры. Настаўнікі ў час нашага мерапрыемства абменьваюцца вопытам, а сярод вучняў завязваюцца новыя знаёмствы, — заявіў намеснік старшыні ўправы музейнага аб'яднання Ян Карчэўскі. — Пасля выступу Аляксандра Петручука паявілася ў мяне таксама ідэя, каб наладзіць супольны беларускі канцэрт вучняў і бацькоў.

Несумненна мерапрыемства, якое ў галоўным ладзіць Ян Карчэўскі, было трапнай ідэяй, накіраванай да шырэйшай гайнаўскай публікі.

Масток разладу

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

На працягу апошніх двух тыдняў героямі ўсіх падляшскіх медыяў сталі жыхары вёсак Залукі ды Падзалукі Гарадоцкай гміны. Канфлікты паміж насельніцтвам і ўладай — амаль звычайная з'ява, таму і не здзіўляе войт Гарадоцкай гміны Веслаў Кулеша, кажучы: „Я ведаў, што праца войта будзе цяжкай, але не думаў, што праца з людзьмі будзе такой балючай". Праўда, калі я з'явілася ў войта са справай залучанскага мастка, развёў ён рукамі. „Што ж мне рабіць?" — спытаў рытарычна.

Пра тое ж самае пытаюцца жыхары згаданых вёсак. Адным перш за ўсё вельмі цяжка выбрацца з Падзалукаў за гэтак званым хлебам. Праз Радунін дарога падаўжаецца на пару кіламетраў, але, паводле некаторых, на машыне свабодна праедзеш. З другога боку старэнькія людзі на машынах не катаюцца, толькі ходзяць пешшу або карыстаюцца роварамі, і па гэтым прыстойным мастку праехаць і прайсці можна ім свабодна. Адзін з жыхароў смяяўся нават, што, склаўшы бакавое люстэрка ў машыне „Дэу Ціка", праедзеш праз масток на другі бок. Разумею, што гэта толькі такія эксперыменты, бо частка жыхароў, у якіх свае машыны, ездзіць імі і ў горад, дзе таксама можна падацца ў краму. Едучы з Падзалук у Гарадок, не трэба нават праязджаць праз Залукі, а калі ехаць у Беласток, то два дадатковыя кіламетры не паўплываюць значна на страту бензіну. Аказваецца, што залучане маюць таксама свае патрэбы і ў Падзалуках. Пасля продажу залучанскага гравійнага кар'ера па жвір трэба ездзіць у суседнюю вёску. Але на пытанне пра клопаты з транспартам адказваюць, што няма вялікіх праблем. Чаму? Бо дарога звычайная, жвіровая. А як жа інакш.

Разумею, што нашы людзі зберагаюць традыцыю. Быў масток, то і быць мусіць. У выніку размовы ў гміне высветлілася, што гэты масток не стаіць на ўліку, а калі так, то такі мост не мае права існаваць. Звычайныя жыхары наогул не цікавяцца законамі і праблемамі ўлад. Наадварот, гэта часцей улады выкарыстоўваюць магчымасці, не дбаючы адначасова аб правы людзей. Не магу сказаць, што сітуацыя ў Гарадоцкай гміне супадае з такой уявай адносін чалавек — улада. Войт гміны мае права абапірацца на законы ў галіне будовы мастоў і воднае заканадаўства, таму карыстаецца імі, тым больш, што здарэнні ў нашай краіне падказваюць гэта як самы бяспечны выхад са склаўшайся сітуацыі. Зусім нядаўна пракурор абвінаваціў сямятыцкіх чыноўнікаў у незаконным пабудаванні маленькага мастка, які крыху аблегчыў жыццё тамашнім жыхарам, але не стаяў на ўліку і будаваўся без афіцыйных дазволаў. Не так даўно заваліўся таксама мост у Каменнай Гары. Там аднак ніхто да моста не прызнаецца, таму і няма каму яго рамантаваць ды выплачваць кампенсацыі. У Залуках стары масток пабудаваны быў на грамадскіх пачатках і можа таму жыхары да яго так прывязаныя. Перад рэканструкцыяй гміна яго разабрала, але невядома дзе прапалі дошкі. Гэта таксама, мабыць, забалела мясцовых. Таму і не пагаджаюцца яны на новую версію камунікацыі, якой, дарэчы, зусім не павінна быць.

Што зрабіць у такой сітуацыі? Войт чакае нейкай размовы ў гэтай справе, бо ў час апошняй яго сустрэчы ў Залуках ніхто пра масток не спытаўся. Паводле яго ацэнкі, працэдуры будуць цягнуцца амаль год, а грошы, каб дапамагчы гэтым вёскам, у гміне знойдуцца. Аднак варта размаўляць непасрэдна, асабліва ў сітуацыях, з якіх выхад знайсці вельмі проста. Тады напачатку варта збудаваць мост узаемазразумення.

„Дзяды" на беларускім чацвяргу

Калі святкавалі „Дзяды"? Няма такога канкрэтнага тэрміну, даты. У народзе казалі, што „Дзяды" пачынаюцца тады, калі ўжо выкапаюць бульбу або „дзяды жывуць у восень на «змітры»" (у дзень св. Дзмітрыя — Г. К.). Абрад прымеркаваны да першай паловы лістапада і вядомы ён амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі — у сваіх навуковых доследах магістр Гражына Харытанюк з'ездзіла Беларусь. Дакладчыца прыводзіла выказванні канкрэтных людзей з канкрэтнага месца. Памінанне продкаў, хоць адмыслова падрыхтаванае, ладзілі ў будзённы дзень, у сямейным крузе, найчасцей у хаце. Трызна ў нечым нагадвала куццю. У акне ставілі пасудзіну са збожжам і свечкай. На стале з'яўляліся стравы, як куцця, верашчака, клёцкі, капуста, квас. Абавязкова павінна з'явіцца і галава жывёлы, напрыклад, пеўня. Задачай гаспадароў было накарміць духаў, каб яны дапамагалі і служылі ў жыцці...

Грунтоўны і займальны даклад магістр Гражыны Харытанюк, наладжаны 13 лістапада г.г. Кафедрай беларускай культуры ў Беластоку, даў пачатак новай ідэі. Працаўнікі кафедры, з новай загадчыцай прафесар Ліліяй Цітко, рашылі вярнуць традыцыю „беларускіх чацвяргоў".

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Магістр Гражына Харытанюк выступіла з дакладам „Абрад Дзядоў у беларускай культуры"

— Мы хочам прэзентаваць дасягненні філалагічных універсітэтаў у Беластоку, Любліне і Варшаве, — сказала доктар Лена Глагоўская, — хочам таксама запрашаць гасцей з Беларусі, каб супольна прыблізіць воблік сучаснай беларускай культуры.

(гак)

Аб беларускіх мерапрыемствах у Польшчы

13-15 лістапада 2008 года ў Польшчы па ініцыятыве Пасольства РБ і пры фінансавай падтрымцы Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы быў праведзены шэраг культурных мерыпрыемстваў з удзелам творчай дэлегацыі з Беларусі.

13 лістапада ў Музеі літаратуры імя А. Міцкевіча ў Варшаве адбыўся Беларускі вечар, прысвечаны 210-годдзю з дня нараджэння Адама Міцкевіча. Падчас вечара адбыліся прэзентацыя дакументальнага фільма Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі „Эпоха Адама Міцкевіча" з удзелам аўтара Алега Лукашэвіча, адкрыццё фотавыстаўкі „Сцежкамі Адама Міцкевіча" па выніках праведзенага ў Беларусі міжнароднага фотапленэру, прысвечанага юбілею паэта і выстаўкі з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, канцэртнае выступленне ансамбля старадаўняй музыкі „Сальтарэла" з Пінска.

14 лістапада Беларускі вечар быў праведзены таксама ў Вілянаўскім палацава-музейным комплексе ў Варшаве — былой летняй рэзідэнцыі польскіх каралёў. У час вечара, які адбыўся ў параднай Белай зале комплекса, былі прэзентаваны адным з аўтараў Алегам Лукашэвічам фотаальбомы „Спадчына Беларусі" і „Скарбы Беларусі", а таксама адпаведная фотавыстаўка, з цікавай канцэртнай праграмай, у якую былі ўключаны музычныя творы беларускіх і заходнееўрапейскіх кампазітараў XVI-XVIII стагоддзяў, выступіў ансамбль „Сальтарэла".

На вышэйадзначаных мерапрыемствах выступілі пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Лідзія Макарэвіч, аўтар і кіраўнік беларускага тэлепраекта „Эпоха" Алег Лукашэвіч, дырэктары Музея літаратуры імя А. Міцкевіча і Вілянаўскага палацава-музейнага комплекса Януш Адрованж-Пянёнжэк і Павел Ясканіс. Сярод прысутных былі прадстаўнікі дыпламатычных устаноў і кіраўнікі польскіх дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, прадстаўнікі беларускай меншасці ў Польшчы, журналісты беларускіх і польскіх СМІ.

Прадстаўленыя беларускія фільм, альбомы і выстаўкі, а таксама канцэртныя выступленні ансамбля „Сальтарэла" выклікалі вялікую зацікаўленасць і актыўнае абмеркаванне сярод прысутных на вечарах.

У час знаходжання ў Варшаве дэлегацыя Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры пазнаёмілася з вопытам дзейнасці польскіх музеяў у Варшаве, узгадніла і падрыхтавала да падпісання праект Дамовы аб супрацоўніцтве з Музеем літаратуры імя А. Міцкевіча.

15 лістапада 2008 г. прэзентацыя фільма „Эпоха Адама Міцкевіча" і канцэртнае выступленне ансамбля „Сальтарэла" адбыліся таксама ў Агульнаадукацыйным ліцэі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Фільм і канцэртнае выступленне беларускага калектыву былі з вялікай цікавасцю прыняты настаўнікамі і навучэнцамі ліцэя.

Прэс-служба Пасольства РБ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Стары зубр

Жыў адзінокі стары зубр. Калісьці ён таксама быў маладым і дужым, мог пабароць любога саперніка, ускінуць на рогі і распароць чэрава драпежніку, які пасмеў напасці на цара Белавежскай пушчы. А калі дужа разгневаецца, дык сваім моцным ілбом валіў дрэвы, рыў капытам глыбокія ямы. Ён быў прызнаным важаком статка.

Але з цягам часу сіл станавілася менш, ногі слабелі, поўсць тускнела і там-сям на скуры з'явіліся плешыны. Маладыя самкі пагардліва мінаці яго пры сустрэчы, а здаровыя зубры глядзелі на самотніка абыякава. Ён цяпер нікому не замінаў дарогу, не пагражаў расправай непаслухмяным. Сам меў патрэбу ў дапамозе. Асабліва ўзімку, калі цяжка станавілася здабываць пад цвёрдым снежным шарпаком корм.

Гэтага вялікага старажыла лесу добра ведалі леснікі і егеры. Не раз даводзілася ім бачыць вольны статак белавежскіх зуброў то ва ўрочышчы „Дзікі Нікар", то на Плянце, то на новаасвоеных землях. І кожны раз на чале статка быў заўважаны волат па мянушцы Барон.

Але надышоў час, калі стала цяжка выконваць функцыі важака. Жыццё запаволіла яго імклівы бег. Ён усё часцей адставаў ад гурту і ў рэшце рэшт апынуўся ў адзіноце ў глухіх імшарах дрымучай пушчы.

Лясныя ахоўнікі шкадавалі старога Барона. Развозячы корм, яны заўважалі сярод густога ельніку сумную постаць усё яшчэ магутнага звера. Ён стаяў непадалёку ад кармушкі, быццам з асуджэннем пазіраючы на мітусню сваіх суродзічаў, якія з дапамогай моцных рагоў забіралі ежу ў слабейшых. Яму таксама кідалі паводдаль некалькі буракоў, бярэмя сухога духмянага сена на той выпадак, калі не ўдасца падсілкавацца за агульным сталом.

Зубр не кідаўся на корм, нават, калі быў галодны. Захоўваў, як і належала важаку, сваю зубрыную годнасць і пачуццё асцярожнасці да ўсяго, што рабілі людзі. Ён заўсёды асцерагаўся людзей, бо ў іх руках магла бліснуць смяротная зброя. І тады, калі раздаваліся ўдалечыні першыя стрэлы, ён адводзіў зуброў далей у глухамань пушчы, падпарадкоўваючыся звярынаму інстынкту.

Цяпер Барон амаль страціў разам з магутнай сілай цара лесу і інстынкт самазахавання. Ён падпускаў блізка не толькі егераў, але і чалавека з фотаапаратам. Зубр нерухома стаяў, пакуль вучоны паспешна шчоўкаў яго з усіх бакоў, баязліва пазіраючы на магутную постаць звера. Велікан лесу не мог ведаць, што здымкі вучонага стануць прысудам яго жыццю. Такі ў людзей быў заведзены парадак: як дзікі звер пастарэе

Ілона Ананьева, 10 гадоў. Белая вежа.

і будзе не ў стане даваць патомства, альбо захварэе, яго чакае селекцыйны адстрэл.

Аднойчы зімовай раніцай у пушчу прыехала трое скуластых, у плямістых ватоўках невысокіх мужчын. У руках яны трымалі дубальтоўкі і нешта на сваёй мове ціха гаварылі. Раздаліся першыя стрэлы. Адна з куль балюча ўтыркнулася ў шыю Барона. Ён пахіснуўся, але ўтрымаўся на нагах. Зноў прагрымелі залпы. Боль пранізаў усё цела велікана. Сабраўшы рэштку сваіх былых магутных сіл, старажыл памкнуўся ў глыб лесу. Следам зноў прасвісталі кулі, застрагаючы ўнутры. Кроў ручаём пацякла на белы снег, а зубр не здаваўся, быццам закляты. З неймавернай прагай да жыцця ён падняўся з кален і, хістаючыся, рушыў далей. Але апошнія смяротныя залпы з паляўнічых вінтовак падкасілі Барона. Стары важак грознага статка застаўся ляжаць нерухома на цвёрдай зямлі. Паляўнічыя ўсё не рашаліся падысці да яго, усхваляваныя і здзіўленыя. Нават мёртвы зубр увасабляў такую моц і павагу да сваёй першабытнай сілы!

Сціхлі галасы, скончыліся стрэлы. Лес апанавала цішыня. Прырода сцішана сумавала па адзінокім старым насельніку, капытамі якога ўтаптана не адна сцежка-дарожка ў пушчы. Па гэтых слядах водзіць цяпер статак малады, дужы лясны велікан, які спасцігаў звярыную навуку ў нашага старажыла.

Таіса СКУРАТАВА

Галерэя „Зоркі"

Імя і прозвішча: Івона Баршчэўская, гімназія ў Орлі
Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 5,47.
Твая мянушка: не маю.
У жыцці хачу стаць, чаму? Хачу стаць архітэктарам, мне падабаецца гэтая прафесія.
У сяброў цаню: шчырасць, мудрасць, памяркоўнасць, калі яны гавораць праўду, а не хлусяць.
Не люблю: калі людзі крыўдзяць іншых, слабейшых за сябе і калі хлусяць.
Па-беларуску размаўляю з: бацькамі і на ўроках беларускай мовы.
Мой любімы гурт: я не маю любімага гурту.
Каля свайго дома пасаджу: дуб, які вырасце і будзе даваць сілу і магутнасць, кожны раз ён будзе напамінаць мне маладыя гады.

Фота Міры ЛУКШЫ

Міра ЛУКША

Курка з Курашава

Моцныя кіпцікі ў куркі Нюркі.
Любіць пагрэбціся ў старых падмурках
І асабліва, калі замане,
Любіць пазур свой запусціць у кургане,
На Куляшоўскім шляху пагрэбецца —
Пошук вядзе, а не то, каб знясецца.
Квокча Кураш, Нюрчын муж дамавіты,
Певень, як трэба, крыкун працавіты,
Што над Курашава сонца склікае:
— Ой, курка Нюрка мая дарагая!
Жыццё ў куратніку можа быць раем!
Я табе зернейкі, вось, выграбаю,
Дзяцей пільную, цябе ўспамагаю...
Што так глыбока цябе прыцягае,
Што там у зямлі апроч чарвякоў?
— Кліча мяне, чуеш, покліч вякоў!
Такі кароткі век наш курачы...
Ці над магілкай хто-лень заплача?..
А ў курганах колькі жыццяў схавана...
Вось даграбуся — ажывуць ды ўстануць!!

Зося з першага „а” класа

— 8 —

Пасля размовы з дырэктарам Янка Рыбачук стаў вельмі суровым. Вядома, ён баяўся, што Баршчэўскі выкіне яго з работы. З гэтага моманту выхавацель кожны раз правяраў ацэнкі вучняў.

— Гняздоўская! Чаму ў цябе голая адзінка па хіміі?

— Я... я... я... буду папраўляць гэтую ацэнку, — ціха адказала дзяўчына, — я вучылася да кантрольнай, але яна была вельмі складанай.

— Не веру я табе! — адказаў Рыбачук. — Чаму ўсе напісалі як трэба, а ты адна не дала рады?! Відаць, у цябе дурная галоўка.

— Заўтра я буду пісаць паправачную, — ледзь не плачучы адказала дзяўчына. Ёй было прыкра і сумна, што настаўнік прынізіў яе пры хлопцах.

Вечарам Зося паспрабавала зубрыць хімію. „Шкада, што Пятрушэня мне не дапамог”, — думала яна. Успамін іх сустрэчы моцна хваляваў дзяўчынку. І чаму так дзіка ў іх атрымалася?!

Апрача Зосі паправачную пісаў Тамаш, ён атрымаў тройку. Хлопец сапернічаў з Паўлікам Пятрушэнем і не мог сабе дараваць такой ацэнкі. Паўлік, вядома, зарабіў шасцёрку!

Настаўніца пасадзіла Зосю і Тамаша за апошняй партай, а сама стала весці ўрок. Калі Зося пабачыла задачы, моцна спалохалася. Яна амаль нічога не разумела. Затое Тамаш як накручаны кляпаў задачы. Ён вокамгненна скончыў і зірнуў на дзяўчыну. У Зосі нічога не атрымлівалася, яна выдумвала нейкія формулы і заносіла іх на сваю белую картку...

— Зося! — шапнуў Тамаш. — Давай, абмяняемся.

— Што? — дзяўчына была настолькі ашаломленая, што адразу аддала сваю картку сябру. Тамаш з той жа энергіяй пачаў рашаць яе задачы...

— Настаўніца ідзе ў наш бок! — спалохалася Зося.

— Нічога! — шапнуў хлопец і адвярнуў картку на другі бок.

І дзяўчына зрабіла тое ж.

Пасля кантрольнай Зося была вельмі ўдзячная Тамашу за дапамогу. У яе сітуацыі нават двойка была добрай ацэнкай!

— Я бачу ў цябе вялікія праблемы, — сказаў ужо на перапынку Тамаш, — давай дамовімся ў суботу і табе ўсё растлумачу.

— А напэўна прыйдзеш? — запытала.

Пасля „ўрока” з Паўлам Зося не верыла ў добрыя намеры хлопцаў, якія хацелі падвучыць яе хіміі.

— Вядома, прыйду! — усміхнуўся Тамаш.

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkorowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

„Беларускі андэрграўнд”: зусім не пад зямлёю

„Беларускі андэрграўнд” — адно з вельмі важных музычных здарэнняў. Варта пра тое ведаць, асабліва тым, для якіх беларуская музыка асацыюецца ў Польшчы з фестывалямі „Басовішча” ці „Бардаўская восень”. Самае цікавае, што „Беларускі андэрграўнд” гэта ініцыятыва, якая нарадзілася ў 1990-я гады ў Варшаве сярод беларускіх студэнтаў з Падляшша. Патрабавалі яны свайго мерапрыемства, якое адбывалася б падчас студэнцкага года ў гэтак званы „мёртвы сезон”. Быў гэта таксама выхад з беларускай культурай да польскага асяроддзя.

Першыя канцэрты з гэтага цыкла называны былі Сустрэчамі з беларускай музыкай ды паэзіяй „Басаўка”. Як падказвае назва, у час канцэртаў выступалі перш за ўсё барды, музыкі са скромнай інструментальнай афарбоўкай. Характар канцэртаў быў больш камерны, сяброўскі. З часам нарадзілася ідэя, каб нейкім чынам спалучыць два асноўныя БАСаўскія праекты. Таму на „Беларускім андэрграўндзе” пачалі паяўляцца музыкі, якія пераканалі да сябе публіку „Басовішча”. Дарэчы, тады і „Басаўка” стала „Беларускім андэрграўндам”. На сцэнах варшаўскіх клубаў можна было паслухаць славутых рокменаў ці таленавітыя маладыя гурты. Гралі „Зэт” і „Rima”, „Triquetra” і „Zero-85”, амаль забытыя „Дзеі” ці „Таварыш Маўзер”. Апошнія гады прынеслі шмат зменаў. Па-першае, з'явіліся новыя крыніцы фінансавання, якія, між іншым, разбудзілі сярод студэнтаў апетыты і адвагу.

Адвага праявілася ў праграме і месцах, у якіх адбыліся канцэрты: клубы ў цэнтры Варшавы, папулярныя, вядомыя месцы. А людзі? Прысутнічалі не толькі беларускія студэнты, але і людзі культуры, менш ці больш зацікаўленыя тэмай, а нават выпадковыя асобы. На сцэне з'явіліся музыкі розных жанраў, ужо не толькі рокмены ці бунтаўнікі сцэны, але таксама выканаўцы, якім блізкі заклік „yo-yo men? what's up!” ці вядомыя зоркі жанру фольк. Няма выразнай ідэйнай падборкі, але затое відаць развіццё і энергію гэтых канцэртаў. А гэтага беларускай культуры патрэба.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 48

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 44:

Жырафа, рад, прыз, вежа, глыб, расказ, цок, коска, пошта, вушы, зуб, воск, краска, жылка. Жывоцік, вы, рыжык, вол, пуск, кошка, грошы, пласт, рыска, рыбка, за, густ, аздоба.

Узнагароды, **каляровыя фламастэры**, выйгралі: **Габрыель Кузьмін** з Бельска-Падляшскага, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава, **Анна Аўксянцюк** і **Анна Каліноўская** з Чыжоў. Віншуем!



Вершы Віктара Шведа

Пасля гонкі

Пасля гонкі і перамогі
Пытае конь каня другога:
— Да перамогі твой ухіл.
Колькі ты маеш конскіх сіл?

А пераможца тут пыхліва
Патрос развеянаю грывай:
— Сіл конскіх маю вельмі
многа,
Калі адношу перамогі.

Нованароджаны

Хваліцца сяброўкам Ната:
— Маю малюсенькага
брата.
— А на каго у вашай хаце
Скажы, падобны малы
браціК?

Сцвярджаюць усе дамаседы:
Падобны надта ён да дзеда.
— Дык смешнае дзіця такое,
Калі з вусамі, барадою.

Музейчык у Арэшкаве

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У Падставовай школе ў Арэшкаве дзеткі ахвотна вучацца розным прадметам, у тым ліку і роднай беларускай мове. На беларускіх конкурсах, пад наглядам настаўніцы беларускай мовы Ірэны Герасімюк, паспяхова выступаюць з вершамі, прозай і расказамі на беларускай мове, а вакальны калектыў „Незабудкі", якім апякуецца матушка Беата Маркевіч, прэзентуе высокі ўзровень спеву і не адзін раз перамагаў на конкурсах. Жыхары Арэшкава, навакольных вёсак і хутароў дружна баранілі сваю школу перад закрыццём, калі паявілася пагроза яе ліквідацыі. Дапамагалі рамантаваць школьны будынак і ахвотна парадкавалі навакольную прышкольную тэрыторыю.

Ініцыятар стварэння музейчыка Уладзімір Галёнка з настаўніцай беларускай мовы Ірэнай Герасімюк (злева) і найбольш актыўнымі мамамі, якія збіралі экспанаты і абсталёўвалі выставачныя залы

Стварылі рэгіянальную залу

Супрацоўніцтва школы з бацькамі дало станоўчыя рэзультаты. З ідэяй сарганізаваць у нявыкарыстаных памяшканнях рэгіянальную залу выступіў Уладзімір Галёнка — гмінны радны ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта, а яго ідэю падтрымалі бацькі. У школе ўжо былі сабраны некаторыя экспанаты, але знаходзіліся яны ў зале, дзе адбываецца навучанне беларускай мовы.

— Стварэнне рэгіянальнай залы гэта ідэя бацькоў і яны самі збіралі ўсе экспанаты, абсталёўвалі выставачныя залы, — кажа дырэктар школы Бажэна Давідзюк, якая наглядала за цэлым мерапрыемствам адкрыцця рэгіянальнай залы, якое адбылося 16 лістапада.

— Мы сабралі экспанаты за адносна кароткі час, а гэта ўсё дзякуючы вялікай працы бацькоў і ахвярнасці нашых людзей, якія бясплатна перадавалі нам экспанаты, што часта залежваліся на паддашках. Аднак мы маем магчымасць папаўняць іх новымі, калі паявяцца цікавыя прылады працы ці старая вопратка. Нашу рэгіянальную залу змогуць наведваць і прыезджыя, калі загадзя дамовяцца, каб ім адчыніць і паказаць наш музейчык, — кажа радны з Пасечнікаў Уладзімір Галёнка.

— Хадзілі мы да старэйшых людзей, лазілі па паддашках і збіралі даўнія прылады працы і старую вопратку, — кажуць Барбара Мішчук і Іаанна Куптэль. — Прытым мы і самі многаму навучыліся ды пазнаёміліся з прыладамі, якіх ужо не спаткалі ў сваім жыцці.

— Ёсць у нас і вельмі каштоўныя экспанаты па даўнасці, напрыклад, дыядэма з 1926 года, якая прышпільвалася да велюму ў час вянчання. Але такое рабілі толькі дочкі багацейшых гаспадароў, — гаворыць Тэрэса Навіцкая. — Мы паказваем на выстаўцы таксама крыху навейшыя экспанаты, напрыклад, старыя экземпляры „Нівы" ці „Пшыяцюлкі".

Найбольш актыўна ў арганізаванне музейчыка ўключыліся Галена Грушэўская і Івона Авярчук. Самую вялікую колькасць экспанатаў перадалі ім Ліля і Уладзімір Літвінюкі. Паявілася канцэпцыя, каб музейчык напамінаў інтэр'ер вясковай хаты з трох памяшканняў. У вялікім пакоі знаходзяцца даўні ложак, пакрывалы, макаткі, вопратка і малітоўны куточак. Пад іконай, прыбранай ручніком, знаходзіцца стары вынасны крыж і ікона Юрыя-Пераможцы, апраўленая на тронку.

— Святы Юрый-Пераможца гэта апякун хатняй жывёлы і таму паўсюдна карыстаецца ён павагай. А вынасны крыж у сёлах, дзе не было царквы, так як у мінулым у Арэшкаве, замяшчаў харугвы і ставіўся перад домам пакойніка, а пасля з ім пакойніка неслі на могілкі, — тлумачыць протаіерэй Лявонцій Анхім, які з прыхадской царквы падарыў у музейчык згаданыя крыж і ікону.

У кухні — многа гаршкоў, збанкоў, „дваянкі" і прылады працы, якімі карысталіся гаспадыні. Тут таксама расстаўлены кросны і іншыя ткацкія прылады.

Экспанаты будуць служыць перад усім адукацыі наймалодшага пакалення, каб памятала яно аб славутым мінулым родных вёсак, традыцыях і культуры людзей, якія ў час апошняга перапісу насельніцтва не саромеліся адкрыта назваць сябе беларусамі. Іх продкі не адракаліся ад сваёй роднай мовы і аб гэтым трэба напамінаць жыхарам Арэшкава і навакольных сёл, каб вучылі сваіх дзетак гаварыць па-свойму.

— У музейчыку будзем ладзіць урокі беларускай мовы, — гаворыць настаўніца беларускай мовы Ірэна Герасімюк. — Збіраннем экспанатаў мы, настаўнікі, ужо не займаліся, але дапамагалі абсталёўваць пакоі і ладзіць экспазіцыі. Крыху мы карысталіся парадамі дырэктара Беларускага музея ў Гайнаўцы Яна Карпюка, які быў прысутны і ў час мерапрыемства.

Вучні хлебам і соллю прывіталі старшыню Рады Гайнаўскай гміны Юзафа Веслава Камарэўскага. Пасля малітвы протаіерэй Лявонцій Анхім асвяціў памяшканні школьнага музейчыка, затым сабраныя, прыглянуўшыся экспанатам, перайшлі ў спартыўную залу. У рамках падзякі мясцоваму насельніцтву за перадачу музейчыку экспанатаў былі наладжаны мастацкія выступленні вучняў і дарослых спевакоў. Пасля афіцыйных прамоваў перад сабранымі выступілі „Незабудкі", якія сваім прыгожым спевам захапілі мясцовую публіку, а дзеткі пад наглядам настаўніцы беларускай мовы Ірэны Герасімюк паказалі сцэнку з вышываным ручніком.

Пайшло пад сорак

Покі перад сабранымі выступілі мясцовыя „Арэшкі", на арэшкаўскі манер і з арэшкаўскім рэпертуарам спявала трыо са студзіводскай „Жэмэрвы", якая фальклорнаму спеву вучылася спачатку менавіта ад „Арэшак". Старшыня аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах" Дарафей Фіёнік уручыў жанчынам з Арэшкава новавыдадзеныя студзіводскім аб'яднаннем кампакт-дыскі з іх песнямі, запісанымі на працягу пяці гадоў у час фестываляў „Там по маёвуй росі" і „Олень по бору ходіт". Побач 25 песень на кружэлцы запісана таксама сцэнка „Вячоркі ў маёвую суботу". Несумненна, спявачкі з Арэшкава заслужылі на грунтоўны 70-хвілінны кампакт-дыск, калі ўлічыць іх цудоўны спеў і поспехі на аглядах. Арэшкаўскія народныя спявачкі моцна радаваліся, калі ў руках трымалі кружэлкі.

— Клопат у тым, што дома няма ў нас на чым праслухаць нашы песні з кампакт-дыска. Можа ўнукі прывязуць адпаведную апаратуру, — разважала кіраўнік калектыву Надзея Грушэўская.

А можа ў гміне знойдзецца нейкі прадпрымальнік і падорыць спявачкам плэер, каб жанчыны маглі вечарамі слухаць запісаныя песні, з якімі выступілі таксама ў час мерапрыемства.

„Арэшкі" ўжо немаладыя. У мінулым годзе адзначылі яны 35-годдзе сваёй дзейнасці і зараз можна сказаць, што ім пайшло пад сорак. Так могуць сказаць жанчыны з калектыву, калі нехта спытае іх пра век, бо іх прыгожы галасісты спеў і гумар не паказваюць на пажылы ўзрост.

— Арэшкаўскіх жанчын трэба моцна хваліць за багацце песень, якія яны захавалі ад забыцця і прэзентуюць на сцэне. На вялікую ўвагу заслугоўвае іх непаўторная манера спеву, поўная гармоніі. Кабеты без прафесійнай адукацыі навучыліся вельмі ўмела карыстацца сваімі цудоўнымі галасамі і могуць доўга спяваць без адпачынку, — пахваліў „Арэшак" Дарафей Фіёнік.

На пахвальныя словы заслужылі таксама дзяўчаты са школьнага калектыву „Незабудкі". Іх апякун матушка Беата Маркевіч паінфармавала, што дзяўчаты, калядуючы, збіралі грошы, каб выдаць кампакт-дыск са сваімі песнямі, і шукаюць спонсараў для рэалізацыі такой ініцыятывы.

Жыццё ў цемры

Набліжаецца да канца 2008 год. Якім ён быў для нас, нашага насельніцтва, нашых састарэлых вёсак? Калі бываю над Семяноўскім вадасховішчам і з берага Старога Двара гляджу на плаціну, мая душа напаўняецца смуткам, тугой па вёсках, якія апынуліся на дне штучнага вадаёма. А былі калісь вёскі Лука, Боўтрыкі, Буды, Рудня. Якія ж цікавыя людзі ў іх жылі — багатыя душой, незвычайныя. Калісьці, калі зойдзеш у якую-небудзь хату за патрэбай, цябе не адпусцяць, пакуль не дапамогуць, не параяць. Дапамагаць адзін аднаму было справай натуральнай.

У Боўтрыках былі свае школа і святліца, у якіх бурліла культурнае жыццё. Мясцовая моладзь вылучалася інтэлігентнасцю, беражлівасцю да спадычны продкаў, музыкальнасцю. Летнімі вечарамі дзяўчаты і хлопцы збіраліся на лавачках спяваць народныя песні.

Рудня славілася таленавітымі самавукамі, майстрамі на ўсе рукі, а Гарбары — рамеснікамі. З-пад малатка кавалая Васіля Палецкага выходзілі вазы, сані, плугі і іншыя земляробчыя прылады. Столяр Ігнат Палецкі ўмеў ставіць дамы, рамантаваць цэрквы. Не страшнай яму была любая вышыня. Самавук Валодзя Палецкі быў гадзіннікавым майстрам і музыкантам. Сотні вяселляў і сотні музыкаў адыграў ён.

Усё гэта было. Усё гэтае багацце памалу забываецца, страчваецца разам з людзьмі, які адыходзяць на вечны адпачынак. Па некаторых вёсках засталіся апошнія сляды — крыжы, якія нагадваюць Гарбары, Рудню, Буды, працягваюць памяць аб іх. Перад гэтымі крыжамі часта спыняюцца былыя жыхары згаданых вёсак, здымаюць шапкі, стаяць у глыбокім задуменні, запальваюць лампадкі, успамінаюць суседзяў і продкаў. Час ад часу пры крыжах адбываюцца рэлігійныя ўрачыстасці.

Але крыжа не маюць Боўтрыкі. Ніхто з былых жыхароў гэтай вёскі, якія раней шанавалі сваё роднае, не можа абыякава ставіцца да ўшанавання памяці сяла. Выхадцаў з Боўтрыкаў многа, сярод іх шмат маладых, матэрыяльна абяспечаных. Аднак да сённяшняга дня ніхто не заняўся ўстанаўленнем крыжа па сваёй вёсцы Боўтрыкі.

Шаноўныя землякі баўтручане! Лепш раз у жыцці запаліць свечку пры помніку вашай вёскі, чым штодзённа жыць у цемры забыцця.

Дзед ДАНІЛА

У Сейме пра беларусаў

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Калі ў Сейме Анджэй Лепер тлумачыўся камісіі па справах нацыскаў, чаму як віцэ-прэм'ер трымаў аж пяць мабільнікаў, перад сеймавым гмахам пратэставалі прадстаўнікі Саюза польскага настаўніцтва, а ў сенацкіх кулуарах прамаваўся горад Рацібуж з нагоды свайго 900-годдзя, сеймавая камісія па справах нацыянальных і этнічных меншасцей занялася пытаннямі тоеснасці, асіміляцыі і акультурацыі беларусаў у Польшчы. Ініцыятарам такой дэбаты быў віцэ-старшыня гэтай камісіі, падляшскі дэпутат ад СЛД Яўген Чыквін. Дзякуючы ягоным стараннням высвятляць праблему прыехалі беластоцкія ўніверсітэцкія прафесары: Андрэй Садоўскі, Уладзімір Паўлючук і Альжбета Чыквін. На сеймавай зале паявіліся таксама, м.інш., упаўнаважаны ваяводы па справах меншасцей Мацей Тэфэльскі, дарадчык падляшскага маршалка па гэтых пытаннях Марк Масальскі, Васіль Сегень у якасці прадстаўніка Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Вядома, амаль зусім руцінна, былі прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ды Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны. Пасяджэнне, якое працягвалася больш за дзве гадзіны, пачаў прадстаўнік МУСіА:

— Дзеянні нашага ведамства накіраваны на стрыманне працэсаў асіміляцыі і акультурацыі меншасцей, у тым ліку і беларускай.

Пералічыў задачы, якія былі прафінансаваны міністэрствам у мінулым і сёлета.

З дакладчыкаў першым узяў годас сацыёлаг праф. Андрэй Садоўскі:

— Я згодны з пазіцыяй Зыгмунта Баўмана, што найчасцей „членаў меншасцей, значыць, слабейшых грамадскасцей прыпісваецца да этнічнай супольнасці без пытання пра іх згоду". Прымаю прадпасылку, што нельга дэкрэтаваць меншасцям, якія рысы мусяць яны праяўляць, каб быць трактаванымі як нацыянальныя меншасці.

Адзначыў:

— Нельга інтэрпрэтаваць меншасцям, якія рысы мусяць праяўляць, каб быць меншасцю. Аўтаідэнтыфікацыя не заключаецца ў тым, каб адказаць: „хто я", але мець свядомасць таго, якія вынікі гэта пацягне за сабою. Беларуская меншасць у Польшчы гэта ў сапраўднасці праваслаўная меншасць.

Іншыя дакладчыкі гэтае апошняе пытанне таксама вельмі моцна адзначалі і, як здавалася, не толькі па прычыне факту, што дэпутат Чыквін з'яўляецца галоўным рэдактарам штомесячніка „Przegląd Prawosławny", атрымліваючага датацыю з пулькі канфесійных, а не нацыянальных меншасцей (не ўлічваючы беларускіх укладышаў). Прафесар Садоўскі вылічыў, што асобы праваслаўнага веравызнання налічваюць больш за 65% ад агульнага ліку жыхароў Гайнаўскага павета, каля 40% Бельскага павета, каля 15% Беластоцкага павета і крыху больш за 10% Сакольскага павета.

Злева: Альжбета Чыквін, Уладзімір Паўлючук і Андрэй Садоўскі.

Адзначыў:

— Складаны досвед нацыянальнай дыскрымінацыі міжваеннага перыяду, незавершаныя спробы этнічных чыстак у час вайны і непасрэдна пасля яе заканчэння, прапагандаванне гамагеннасці польскага грамадства як пасляваеннага поспеху Народнай Польшчы, асабліва ў час да 1956 года і ў сямідзесятыя, у спалучэнні з прагматычнай рэакцыяй праваслаўнай меншасці (часткова беларускай), каб не вылучацца, спрычыніліся да таго, што на парозе васьмідзесятых гадоў асноўнай формай выяўлення нацыянальнай тоеснасці быў праваслаўны паляк. Асноўным комплексам абумоўленасцей, якія пераламалі здавалася б няўхільныя працэсы асіміляцыі беларускай меншасці да нацыянальнай польскай большасці былі паралельныя плыні дзеянняў: перш за ўсё жнівеньскія падзеі і іх наступствы ў паводзінах меншасці ды дзеянні асабліва ў гарадах устаноў праваслаўнай Царквы. Наступствы жнівеньскіх падзей значна вызвалілі прынамсі два напрамкі ператварэнняў: выклікалі далейшыя формы ўцёкаў ад беларушчыны, але з другога боку значна спрычыніліся да ўзнікнення новай катэгорыі беларусаў — ідэалагічных, якіх я называю новымі беларусамі.

Садоўскі выказаўся за ўжыванне тэрміну „польскія беларусы", а не „беларусы ў Польшчы", паколькі гэтае апошняе акрэсленне намякае на іміграцкі і часовы характар пражывання прадстаўнікоў беларускай меншасці і не паказвае сутнасці іх гістарычнай і трывалай сувязі з польскай дзяржавай і культурай. Важным палічыў факт, што беларуская меншасць ужо ад 1956 года падлягае працэсам інстытуцыяналізацыі, а яго прыспяшэнне наступіла пасля 1989 г.:

— З'явілася новая катэгорыя ідэалагічных беларусаў, тэарэтычна і арганізацыйна падрыхтаваных да быццам бы новага пачатку стараняў па ўзмацненню статусу беларусаў як нацыянальнай меншасці ў Польшчы ды здабыванню для беларускай меншасці этнічнага субстрату.

Пасля дадаў:

— Бывае, што чытаючы прэсу, складаецца ўва мне ўражанне, што меншасць трактуецца як палітычная партыя. Яна, так як і большасць, увесь народ, з'яўляецца палітычным букетам.

У сваю чаргу сацыёлаг і культуразнаўца прафесар Уладзімір Паўлючук гаварыў галоўным чынам пра беларускасць, падставай якое з'яўляецца рэлігійнасць, значыць, праваслаўе, а не этнічнасць, звязаная з культурай і яе мовай:

— Праваслаўным можа быць таксама няверуючы, а нават агностык. У час ПНР у Ваяводскім камітэце ПАРП дзеячы падзяляліся на праваслаўных і каталікоў, хоць, прынамсі па дэкларацыях, былі няверуючымі.

І далей у супярэчлівым тоне:

— Паняцце беларуса на Беласточчыне не адносіцца да праваслаўнага і таго рэлігійнага этасу. Беларусы ў Польшчы ніколі не належалі да беларускай нацыянальнай супольнасці, але якраз да цывілізацыйнай супольнасці праваслаўя. Беларушчына гэтай праваслаўнай групе была наваязана зверху найвышэйшымі вырашальнымі цэнтрамі не толькі Польшчы, але і тымі, што вырашалі аб лёсах свету. Гэтая схема распазнавання рэчаіснасці ўтрымалася аж да ўпадку ПНР.

Пераконваў да тэзісу:

— Ідэнтыфікацыя з беларускасцю вязалася з такой ці іншай ідэалогіяй.

Тут вылучыў дзве падгрупы беларусаў. Першую маюць складаць — у адрозненні ад паняцця прыменага прафесарам Садоўскім, значыць беларусаў ідэалагічных — беларусы палітычныя і ўфармаваныя БГКТ, якіх назваў тутэйшымі. Першыя, на думку праф. Паўлючука, звязаныя з Радыё Рацыя ці Тэлебачаннем БелСат, вядуць палітычную дзейнасць, таксама апазіцыйную ў адносінах да рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Другія, на яго думку, не цікавяцца такімі дзеяннямі, прынамсі калі гаворка пра ўлады Беларусі. Выказаў таксама ўпэўненасць у тым, што беларускі этас стваравуся польскай шляхецкай стыхіяй.

Прафесар Альжбета Чыквін з факультэта педагогікі і псіхалогіі Універсітэта ў Беластоку (у прыватнасці жонка дэпутата Чыквіна) сцвердзіла:

— Беларусы, насуперак паўсюднаму меркаванню, не з'яўляюцца нейкім адзінствам і пакутуюць ад неінтэграванай тоеснасці. Недахоп інтэграванай тоеснасці датычыць таксама іншых нацыянальных груп у свеце, ды тут існуе асаблівая сітуацыя. Маем дачыненне з такім прыкладам, што ў сям'і ёсць трох братоў, а адзін з іх лічыць сябе ўкраінцам, другі палякам, а трэці беларусам, незалежна ад таго, што ўсе яны з дзеда-прадзеда выводзяцца з той самай вясковай традыцыі, праваслаўнай, якая гаворыць па-свойму, і г.д.

— Працэсы акультурацыі і асіміляцыі гэтай меншасці з'яўляюцца з аднаго боку вынікам слабога этасу, але з другога яны — вынік адносін польскай большасці да гэтай меншасці. У адукацыйным сэнсе датычыць гэта большасці Польшчы. Звычайна, калі думаем аб меншасцях, думаем крыху як этнографы, засяроджваючыся выключна на меншасці, а тым часам стасунак да іншага з'яўляецца быць важным пытаннем выхавання сучасных палякаў.

Падкрэсліла:

— Калі стыгмат, значыць, адмоўнае памячэнне якойсьці катэгорыі, можа быць скрыты, дык несумненна будуць яго хаваць. Так ёсць у выпадку беларускай меншасці.

На думку праф. Чыквін, хаванне стыгмату (заціранне „сораму", які вынікае з нацыянальнай прыналежнасці) беларусамі часта заключаецца, м.інш., у змене імён на гучаўшыя па-польску (напр. Алёша — Аляксандр — Aleksander), або на сяганні па імёны проста з каталіцкага календара ці традыцыі асаджанай на Захадзе ды на неразмаўлянні ў публічных месцах „па-свойму":

— Патрэбна дапамога польскай большасці ў дэстыгматызацыі, бо дыскрымінацыі як такой ужо практычна ў нас няма. Толькі адукацыя можа змяніць такія пазіцыі.

У час кароткай дыскусіі член камісіі меншасцей, вядомы рэжысёр, сілезец Казімеж Куц заявіў, спасылаючыся на выступленні дакладчыкаў, а асабліва на словы праф. Чыквін:

— Будучы часткай Еўропы бачым, што мусім яе вучыцца. Я, аднак, упэўнены, што Еўропа таксама павінна вучыцца Польшчы. Палякі павінны вучыцца праблем уласных меншасцей і тут шмат што трэба зрабіць. Пані прафесар мае рацыю, што трэба пачаць ад настаўнікаў. Трэба вымагаць іншыя паставы думання, а для гэтага патрэбна добрая воля.

Дэпутат Яўген Чыквін:

— Канфесійная палітыка нашай краіны, таксама і пры беларускай меншасці, з'яўляецца замала балансаванай.

Дэпутат Мірон Сыч, адзін з віцэстаршынь камісіі (украінская меншасць) у жартоўным тоне спытаўся, на якой мове спадарства Чыквіны размаўляюць адзін з адным дома. Адказ не прагучаў.

Запрошаныя на пасяджэнне камісіі госці, апрача Марка Масальскага, голасу не бралі.

На канец дэпутаты паглядзелі дакументальны фільм Пятра Нестаровіча „Руская полька", зрэалізаваны ў Орлі, натабена роднай мясцовасці дэпутата Яўгена Чыквіна.

Родам з Беласточчыны

З часоў маленства

Беларускі літаратуразнавец і крытык Серафім Андраюк не дужа любіць „высоўвацца” на старонках беларускай прэсы. Ды і сам ён друкуецца рэдка, але, калі ўжо нешта апублікуе, дык ёсць што пачытаць. Сёння, падчас нашай невялікай гутаркі, мы не абмяркоўвалі літаратурнага жыцця, мы не вялі гутаркі пра празаікаў і паэтаў, а я папрасіў шаноўнага Серафіма Антонавіча згадаць сваё маленства, якое прайшло ў роднай вёсцы Градалі на Беласточчыне. І не толькі...

— ***Серафім Антонавіч, што Вам, былому вясковаму хлопчыку, сёння часцей за ўсё прыгадваецца з тых далёкіх часоў маленства? Усё ж за плячыма — жыццёвы шлях у 75 гадоў...***

— Згадкі пра маленства чалавека не пакідаюць ніколі. Так і мяне. У маіх таты Антона Мацвеевіча і мамы Ганны Фёдараўны Андраюк было пяцёра дзяцей і ўсе — хлопцы. Гаспадарка была сярэдняя — дзесьці гектараў 15 зямлі. Усім трэба было працаваць. Таму я рана навучыўся жаць і малаціць. А ў школу пайшоў у 6 гадоў. З таго далёкага вясковага маленства назаўсёды засталіся ў памяці толькі два светлыя ўспаміны. Першы такі: перад хатай за дарогай наш луг. Вясна. Месцамі яшчэ блішчыць вада. Але ўжо цвіце

Злева направа: Серафім Андраюк з бацькам, маці і братамі Антонам і Міколам каля роднай хаты ў Градалях. Канец 1930-х гадоў

лотаць. Жоўтая сонечная прыгажосць і шмат сонца. І другі ўспамін заўсёды стаіць перад вачыма: хата, каля хаты на захад — агромністая вярба. Поўна птушак — галкі, шпакі, вераб'і, сарокі і нават совы. Раніцай вярба ўся асветлена сонцам, птушкі спяваюць, шчабечуць. Проста было „боскае дрэва”...

— ***А пасля былі верасень 1939 года і вайна...***

— Але час пасля верасня 1939 года пакінуў эмацыянальны адбітак нейкай святочнасці і ўзбуджанасці. А вось вайна, часы акупацыі не пакінулі ніводнага светлага ўспаміну. У час вызвалення хаваліся ў склепах, пограбах, акопах. Не раз давялося перажыць бамбёжкі. Здаецца, больш жахлівага нічога не было. Хацелася проста закапацца ў зямлю.

Серафім Андраюк — галоўны рэдактар мінскага выдавецтва „Мастацкая літаратура”. 1990-я гады.

— ***Нялёгка было Вашай сям'і і пасля вайны.***

— Дзесьці адразу пасля вызвалення беларусаў пачалі моцна агітаваць выязджаць у СССР. Маці нікуды не хацела ехаць. А вось дзеці — хлопцы, усе былі за тое, каб ехаць. Тады і вырашылі ўсё ж, як і многія вяскоўцы, паехаць. Нас пагрузілі ў таварны вагон, мы ўзялі з сабой яшчэ кароў, коней і паехалі. Адразу заехалі на Украіну ў Сумскую вобласць.

— ***І як Вас сустрэла тая Сумская вобласць?***

— Прыехалі туды, а там усё разбурана і, галоўнае, няма лесу. Жанчыны-аднавяскоўкі, бо з намі ехалі некалькі сямей, пачалі плакаць і прасіцца дамоў. Мы на цягніку вяртаемся назад у Беларусь. Нехта параіў спыніцца ў мястэчку Шацілкі (сённяшні Слаўгарад) на Магілёўшчыне, маўляў, мы тут былі ў часы Першай сусветнай вайны. Прыехалі туды, а там — зноў усё разбурана. Зноў жанчыны супраць, зноў плачуць і крычаць. І вырашылі ехаць бліжэй да Беласточчыны, да мяжы: калі што, то пешшу пойдзем дадому. Але жаночымі падобнымі разважаннямі ўжо пачалі цікавіцца нават прадстаўнікі пэўных службаў. Таму мы ў канцы 1945 года пакінулі і Магілёўшчыну, хаця некалькі сем'яў засталіся там.

— ***Але на Беласточчыну ў родныя Градалі Ваша сям'я ўсё ж такі не вярнулася...***

— Вядома, не. Мы адны прыехалі ў былы шляхецкі засценак Бербашы Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці. Там і прайшлі мае школьныя гады і юнацтва. Там сёння пахаваны мае бацькі і старэйшы брат. Апусцелая хата развальваецца, зарастае дзікім кустоўем і травою. Толькі памяць зрэдчасу вяртае мяне на Беласточчыну ў родныя Градалі, а ў Бербашы я прыязджаю толькі на магілу бацькоў і брата.

Сяргей ЧЫГРЫН



Непадалёк ад Падляшша, з другога боку мяжы з Беларуссю, знаходзіцца не надта вялікае, але і зусім не малое мястэчка з прыкладна 20 тысячамі насельніцтва. Носіць яно назву Пружаны і пэўна нямногім увогуле вядома. Але гэта не значыць, што мясцовым жыхарам няма чым ганарыцца. Адным з прадметаў іхняга гонару без перабольшання можна назваць мясцовы музей, што называецца даволі неардынарна — „Пружанскі палацык”. Менавіта ў яго мы і здзейснім нашу чарговую вітуальную вандроўку.

Каб завітаць на сайт „Пружанскага палацыка”, трэба набраць на сваім камп'ютары ягоны адрас у інтэрнэце: http://museum.pruzhany.com. Перад нашымі вачыма адкрыецца даволі сціплае выяўленне, дзе змешчаны ўсяго толькі дзве карцінкі, і на абедзвюх мы бачым палацык.

Кожная старонка падзяляецца на дзве часткі. Усё звыкла і зразумела: справа — выйсці да разнастайных рубрык сайта, злева — асноўны тэкст той ці іншай старонкі. Практычна ўся найважнейшая інфармацыя аб музеі знаходзіцца на галоўнай старонцы — тут размешчана свайго роду прэзентацыя „Пружанскага палацыка”. „Музей-сядзіба «Пружанскі палацык» — адзіная адноўленая сядзіба такога тыпу ў Беларусі!” — ганарліва сцвярджае ў прэзентацыйным артыкуле дырэктар музея-сядзібы Юрый Зялевіч.

Варта адзначыць, што гэта не адзінае, у чым Пружаны на першым месцы ў Беларусі. Нядаўна там быў пабудаваны Лядовы палац — першая такая будоўля сярод усіх раённых цэнтраў краіны.

Але вернемся да старадаўняга будынка музея. Згодна з інфармацыяй на сайце, там ужо створана першая чарга экспазіцыі — Салон, Кветкавая зала, Паляўнічы кабінет, працягваецца праца над стварэннем Гербавай залы, Малога салона, Трафейнага пакоя і інш. „Наш музей на сёння стаў вядомы і як грамадска-культурны навуковы цэнтр. У ім адбываюцца музычна-літаратурныя вечарыны, навуковыя канферэнцыі па захаванні і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, — распавядае кіраўнік установы. — Нам выпала высакародная місія захоўваць рарытэты, якія дапамагаюць уведаць далёкае мінулае, лепш зразумець сучаснасць і ўпэўнена рухацца ў будучыню, каб гэтыя веды пераходзілі з пакалення ў пакаленне, спрыялі ўзнаўленню і ўмацаванню этна-культурных традыцый, дапамагалі выхаванню самасвядомасці і патрыятызму, пачуцця нацыянальнай годнасці і любові да Бацькаўшчыны”.

У рубрыках сайта падаецца вельмі падрабязная інфармацыя не толькі аб цяперашнім стане музея-сядзібы, але і мноства расповедаў аб тым як выглядалі будынак і прылягаючыя тэрыторыі раней. Каб пазнаёміцца з гэтымі тэкстамі, трэба зайсці на старонку „Сядзіба”. А ў рубрыцы „Фотагалерэя” мы ўбачым выявы палаца з розных бакоў.

Пэўна, найбольш цікавай рубрыкай з усяго сайта з'яўляецца „Бібліятэка”. Такі сервіс не часта ўбачыш на падобных музейных сайтах. Няхай у яе кнігасховішчах усяго толькі дзевяць кніг, але іх можна прачытаць цалкам, спампаваўшы ці адчыніўшы ў фармаце pdf.

Неяк нетрадыцыйна месціцца на сайце старонка навін, ці як яна тут называецца — „Апошнія навіны”. У спісе рубрык яна чамусьці на апошнім месцы. Магчыма таму, што абнаўляецца яна не вельмі часта. Гэта падаецца, бадай, адзіным недахопам сайта, бо цяжка паверыць у тое, што ў грамадска-культурным навуковым цэнтры Пружан цікавыя падзеі бываюць вялікай рэдкасцю.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Трывожныя сімптомы

Васемнаццаты чэмпіянат Рэспублікі Беларусь, які можна лічыць пераходным (таму што з наступнага сезона вышэйшая ліга прыдбае іншы фармат), фінішаваў ціха і без асаблівых эксцэсаў. Барысаўскі БАТЭ датэрмінова стаў чэмпіёнам краіны (ужо пяты раз у гісторыі і трэці раз запар!) і таму ў адным з апошніх тураў мог дазволіць сабе раскошу нават прайграць мінскаму „Дынама”, як лічылася перад чэмпіянатам — галоўнаму свайму канкурэнту і антыподу.

Адзіная інтрыга, якая дажыла да заключнага тура — гэта каму дастанецца срэбра. На яго да апошняга дня прэтэндавалі два сталічныя клубы — „Дынама” і МТЗ РІПА. „Дынама” пасля змены галоўнага трэнера (недарэчнасць леташняга пераходу Ігара Крыушэнкі з Барысава на капітанскі масток бела-блакітных прагназавалася адразу) распрастала крылы. Колішні флагман, які на гэты раз узначаліў вядомы спецыяліст серб Славалюб Муслін, на фінішы набраў крэйсерскую хаду. У апошнім туры „Дынама” разграміла ў гасцях „Савіт”, а вось МТЗ досыць нечакана саступіў на полі „Гомеля”. Думаецца, што Юрый Пунтус застаўся вельмі незадаволены агульным вынікам сваіх „мазаўцаў”. Канчатковы выгляд турнірнай табліцы наступны: **1.** БАТЭ — 67 ачкоў; **2.** „Дынама” (Мінск) — 62; **3.** МТЗ РІПА — 57; **4.** „Шахцёр” (Салігорск) — 51; **5.** „Віцебск” — 51; **6.** „Дынама” (Брэст) — 47; **7.** „Нафтан” (Наваполацк) — 46; **8.** „Смаргонь” — 39; **9.** „Днепр” (Магілёў) — 38; **10.** „Граніт” (Мікашэвічы) — 36; **11.** „Гомель” — 33; **12.** „Нёман” (Гродна) — 33; **13.** „Тарпеда” (Жодзіна) — 31; **14.** „Лакаматыў” (Мінск) — 25; **15.** „Савіт” (Магілёў) — 21; **16.** „Дарыда” (Мінск) — 19. Тры апошнія калектывы пакідаюць вышэйшы дывізіён, які цяпер зазнае скарачэнне да 14 клубаў. З няўдачнікаў шкада хіба толькі баявую „Дарыду”, якая ў значнай ступені стала ахвярай неаб'ектыўнага арбітражу. На змену выбыўшым у наступным годзе прыйдзе ФК „Мінск”.

Відавочна няўдалы сезон правялі „Шахцёр” (ад яго чакалі большага), „Гомель”, „Нёман” і „Тарпеда”. Галоўны трэнер салігорцаў Юрый Вяргейчык адразу пасля чэмпіянату падаў у адстаўку, але пакуль яго ўгаварылі застацца ў структуры клуба.

З іншага боку, акрамя зразумела БАТЭ, у актыў сабе чэмпіянат могуць занесці „Віцебск”, „Смаргонь” і „Граніт”. Тым больш дзіўна, што кіраўніцтва смаргонцаў, нягледзячы на лепшае дасягненне каманды ў гісторыі, адправіла ў адстаўку галоўнага трэнера Георгія Кандрацьева. Рэшта каманд выступіла ў сваю сілу.

Тытул лепшага бамбардыра па праве і сімвалічна падзялілі паміж сабой два форварды чэмпіёна — Генадзь Блізьнюк і Віталь Радыёнаў — па 16 галоў. На адзін мяч меней забіў Арцём Канцавы з МТЗ РІПА.

Найбольш прыкрым вынікам мінулага чэмпіянату стаў паказнік сярэдняй колькасці гледачоў на адным матчы. Сёлета ён склаў толькі 1720 чалавек на адной гульні. Гэта найменшая колькасць заўзятараў за ўсю гісторыю суверэнных першынстваў. Зніжэнне колькасці прысутных на футболе засмучае і прымушае задумацца пра негатыўную тэндэнцыю.

Застаецца дадаць, што ў мінулую сераду без гульцоў БАТЭ, якія рыхтаваліся да матча ў Лізе чэмпіёнаў супраць мадрыдскага „Рэала”, зборная Беларусі бясслаўна прайграла ў таварыскай гульні ў гасцях нацыянальнай дружыне Кіпра — 1:2. Яшчэ адзін трывожны сімптом.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Грахі маладосці

Аб сучаснай моладзі дарослыя звычайна гаворыць, што іх цяжка зразумець. Малалеткі не слухаюцца ні бацькоў, ні настаўнікаў, невядома чым займаюцца. Няма для іх Божага пакарання. У гэты момнт нічуць не задумваемся, што віноўнікамі паталагічных з'яў з'яўляемся мы, старэйшыя. Надта мала займаемся сваімі малышамі, не цікавімся іхнімі паводзінамі ў школе і па-за домам у вольны час. Гавораць аб гэтым педагогі. А калі нават стане вядомым, што сын ці дачушка дрэнна паводзяць сябе, дык глядзім праз пальцы і кажам, што іншыя таксама не лепшыя. Зрэшты, закон забараняе цялеснага пакарання. За гэта могуць прыцягнуць да судовай адказнасці.

У час маей маладосці такога не бывала. Праўда, працвітала ў школах дрэнная звычка курэння папяросаў ці азартнай гульні ў грошы, але гэта не параўнаць з цяперашнімі наркотыкамі ці разбоямі. Тады праходзіла ўсё ціха, бясшумна. Папяросамі найчасцей зацягваліся хлопцы старэйшых класаў, ад пятага пачаўшы. Усім было вядома, што зборным пунктам курцоў былі школьныя нужнікі, якія знаходзіліся ў канцы школьных участкаў. У хаце малалеткі скрываліся перад бацькамі, бо віноўнікаў чакала пакаранне. Больш паўсюднай справай была азартная гульня ў грошы. Пачыналася з „цымбергая" (не ведаю адкуль такая назва гульні) і зводзілася да забівання грэбенем манет у памечаныя на школьных лаўках „вароты". Падобнай гульнёй было адбіванне манет аб сцяну. Збіралася некалькі хлапчукоў і кожны меў жменьку дробных манет. Грошы адбівалі па чарзе аб сцяну хаты. Кожны намагаўся, каб яго манета ўпала чым далей. Задачай наступнага іграка было, каб яго грош упаў чым бліжэй папярэдняга. Пасля пяддзю мерылі адлегласць. Калі растапыраныя пальцы рукі сягалі двух манет, тады ігрок атрымоўваў выйгрыш. Пасля яшчэ круцілі ваўчком, на баках якога было памечана: „N" (нічога) „DS" (дай стаўку), „BS" (бяры стаўку), „BP" (бяры палову) і „BW" (бяры ўсё). Стаўкай было, напрыклад, 10 грошаў. І кожны круціў ваўчком паводле чаргі. Як упала на „дай стаўку", тады дакладаў 10 грошаў і круціў наступны, як упала на „бяры ўсё", дык забіралася ўсё з банку і ігракі папаўнялі банк па 10 грошаў кожны.

Даволі вядомым і шырока распаўсюджаным азартам сярод дарослых была гульня ў карты — у „ачко" ці „бэта". На гэтым можна было патраціць вялікія грошы. Прыпамінаюцца мне шасцідзесятыя гады, калі адзін „прафесіянальны" ігрок з вёскі Д. ездзіў цягнікамі і абдурваў наіўных. Міліцыя сачыла за ім, але з перыпетый заўсёды выходзіў цэла. У гэты час азарт працвітаў на царкоўных фэстах. Памятаю, як на Грабарцы прайдзісветы манілі людзей выйгрышам у карты „белая выйгравае, чорная прайгравае" або гульнёй у рулетку. Не адзін мужык амаль басанож пакідаў святое месца. Хоць з таго часу прайшло шмат гадоў, аднак промысел азарту застаўся. Нядаўна сябра гаварыў, што адзін паважаны мужык прыпушчанскай мясціны „прасвістаў" у покер дзве майстэрні, а справа з домам засталася нявырашанай. Вось, даражэнькія, да чаго можа прывесці дрэнная звычка азарту.

Уладзімір СІДАРУК

Прыемная вестка

Прыемна пачуць, калі адзываецца даўнейшы авангард. Гавару тут аб Міколе Краўчуку з Патокі. Ад нейкага часу зноў з'явіліся ягоныя вершы. Асабліва апошні „Я ж жывы!", надрукаваны ў № 45 ад 9 лістапада, крануў мяне за сэрца.

Ну, добры дзень, мае сябры!
Ужо Вы забылі пра мяне?
Гэта Мікола той з Патокі.
Ён і цяпер яшчэ жыве!

З Міколам Краўчуком сустракаўся я на з'ездах карэспандэнтаў у сямідзесятыя гады. У 1974 годзе, напрыклад, зрабілі мы супольны здымак, на якім увекавечаны Уладзімір Хомік са Слоі, Эдмунд Вайсковіч з Гайнаўкі, ніжэйпадпісаны і аўтар згаданага верша. Гэты здымак захоўвую як рэліквію, бо ён напамінае мне сяброў па пяру і сустрэчы з імі на карэспандэнцкіх з'ездах. Колькі нас тады было? У 1975 годзе, напрыклад, на працягу года „Ніва" надрукавала 634 тэксты дзевяноста пяці аўтараў. Яшчэ два гады пазней, у 1977 годзе, ніўскае кола супрацоўнікаў налічвала 78 асоб. Гэта сямейка! Плён супольнай працы — гэта 642 надрукаваныя тэксты. У „Парнасіку" былі змешчаны 43 вершы дваццаці аўтараў, у гэтым ліку і вершы Міколы Краўчука. Чаму сябра Краўчук толькі зараз адважыўся адгукнуцца? Што паўплывала на такое рашэнне. Няўжо ўнутранае прызнанне да сваёй тоеснасці? Народная мудрасць кажа, лепш позна, чым ніколі. Можна спадзявацца, што шаноўны калега не „заглухне", як раней бывала, толькі стане наследнікам светлай памяці Дзядзькі Кваса. Таго жадаю сабе і чытачам ад шчырага сэрца. А за цудоўныя пажаданні — шчырае дзякуй!

І вось цяпер на заканчэнне
Жадаю Вам усім дабра,
І ўсім, што пішуць
— перш здароўя,
І золата, і серабра!

Уладзімір СІДАРУК

Яшчэ пра Надзею Ільяшэвіч

Да тэкстаў пра настаўніцу Надзею Ільяшэвіч аўтарства майго („Ніва" № 39) і Лены Глагоўскай („Ніва" № 47) дакідаю некалькі дэталяў датычных школы ў Тапалянах. Лічу, што ініцыятаркай заснавання беларускай школы ў Тапалянах у 1942-1943 гг. была менавіта яна. Надзея Ільяшэвіч была ўраджэнкай Тапалянаў, ведала вёску і тагачасныя рэаліі, а яе муж Хведар дзейнічаў у Беларускім нацыянальным камітэце ў Беластоку і мог дабіцца ў акупацыйных нямецкіх улад дазволу на адкрыццё школы. У сувязі з харчовымі цяжкасцямі, прабывала яна ў сям'і ў Тапалянах. Так у час вайны рабілі многія беластачане, калі ў іх былі сем'і на вёсцы.

Пры нямецкай акупацыі ў класе было не больш 18 вучняў, паколькі ў адным радзе стаялі чатыры двухмесныя парты, а ў другім — пяць. У канцавых партах не заўсёды сядзелі вучні. Школа займала адзін пакой у хаце Жэніка Оські.

Як у час акупацыі, так і пасля 1944 года пісалі мы на дошцы крэйдай, якая засталася з савецкіх (1939-1941) часоў — на ўпакоўцы былі рускія надпісы. Для гэтай мэты выкарыстоўвалася яшчэ г.зв. белая глінка, якую прымянялі для бялення сцен у хатах. Камякі глінкі разрэзвалі на падоўжныя кавалкі.

У саракавых гадах дзеці пісалі алоўкамі, пазней рабілі атрамант з хімічных алоўкаў. Яшчэ пазней атрамант прывозілі ў літровых бутэльках з Беластока.

Першапачаткова сшыткі былі шырэйшыя, савецкія. Адкуль іх бралі, не ведаю. Запомніліся мне сшыткі з лінейкамі па дыяганалі для каліграфічнага пісання. Парты былі двухмесныя, кампактныя — з крышкай і лаўкай са спінкай. У крышцы была адтуліна на чарніліцу з атрамантам. Ніжняя частка крышкі складалася з дзвюх частак, якія апускаліся наўскос. Мацаваныя яны былі на завесах і дазвалялі вучню падняцца да вертыкальнай пазіцыі. У 1944-1946 гг. школа змяшчалася ў адным, а потым у двух пакоях у доме Ніны Хоцька. Ініцыятарам аднаўлення школы ў 1944 годзе была Надзея Ільяшэвіч — вопытная арганізатарка і беларуская патрыётка.

Канстанцін МАСАЛЬСКІ

Кафедра беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку

ЗАПРАШАЕ

ў чацвер 27 лістапада 2008 г.
на даклад Лены Глагоўскай
„Прысутнасць беларускай культуры ў Польшчы пасля 1989 г."
Пачатак у 17 гадзін у будынку Універсітэта па вуліцы Лінярскага, 3, зала н-р 1В

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — армянскую прыказку.

1. рахунак паступленняў і даўгоў дадзенай установе ў прыходна-расходных кнігах = 13 _ 2 _ 21 _ 30 _ 4 _;
2. буйны заходнеўкраінскі горад = 39 _ 40 _ 41 _ 9 _ 16 _;
3. вузкая шчыліна, у якую ўстаўляюць выступ другога прадмета пры замацаванні = 3 _ 35 _ 14 _;
4. пешаход = 5 _ 25 _ 32 _ 33 _;
5. ядомы пласціністы грыб з рыжай шапачкай = 36 _ 37 _ 10 _ 20 _ 38 _;
6. горад у іспанскай Галісіі на рацэ Мінья (Tuy) = 28 _ 27 _ 31 _;
7. гарбата = 26 _ 11 _ 12 _;
8. Сяргей, ніўскі даследчык беларускай гісторыі са Слоніма = 17 _ 18 _ 8 _ 6 _ 7 _ 19 _;
9. гумавы або металічны абруч на вобадзе кола = 1 _ 22 _ 29 _ 42 _;
10. гнойная або запалёная ранка на скуры ці слізістай абалонцы = 15 _ 34 _ 23 _ 24 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 43 нумара

Білет, вагон, яўрэй, мех, зенітка, вал, рубін, вона, рыба, снег.

Рашэнне: **Хваляў без ветру не бывае.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Яну Міхалюку** з Чыжоў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 660 egz.

Як варажыла старая цыганка!

Два апошнія дні я правяла ў рэзервацыі гуронаў ля горада Квебек. Уражанні зусім іншыя чым спадзявалася. Набыла дзіўны дыск з этнічнымі спевамі, падобнымі на падляшскія, старыя. Я сама выглядала тут больш па-індзейску чым многія працаўнікі рэзервацыі...

Як бачыш, фірма Д. прывяла там дзе трэба, я адчуваю што патрапіла сюды не без прычыны...

(са справаздачнага э-мейла прэзідэнту фірмы „Дотык")

Тэкст і Фота Ганны КАНДРАЦЮК



Насценныя малюнкі сучасных гуронаў-вендекэ над ракой Кабір Коўба

Быць індзейцам гэта выбар.

— Трэба жыць у клане, дзяліць яго лёс, змагацца за будучыню племя, — паясняе Жак Мішэль, працаўнік універсітэта, народжаны ў французскамоўнай сям'і ў наваколлі Вялікіх азёр. Ён сам нядаўна адкрыў у сабе індзейскую кроў. Кажа, што ў кожнай другой канадскай сям'і такія сувязі. Ці магчыма вярнуцца? Адваротнай дарогі няма.

— Людзі, якія адышлі з племя, — у прыклад мой субяседнік ставіць сваіх продкаў, — яны ўжо страчаныя для індзейцаў. Нават калі хто апамятаецца і схоча вярнуцца. „Ты ўжо не наш, — скажуць, — забірайся, адкуль прыехаў!" Найбольш крыўдна нашчадкам адшчапенцаў, іх таксама індзейцы не лічаць „сваімі". І не ідзе адно пра матэрыяльныя справы (індзейцы звольнены ад падаткаў, могуць паляваць і лавіць рыбу, карыстацца льготамі на некаторыя паслугі, напрыклад, электрычнасць). Важная свядомасць, карані. Файна падумаць, што вырастаеш з прыгожай, багатай зямлі і маеш права на званне прадстаўніка першых нацый Амерыкі.

— А знешні выгляд? — спытала я нясмела. Раней мне сказалі, што спяваю і выглядаю як тыповая індзейка. — Ці мае значэнне?

— Сама пабачыш! — падмаргнуў мне Жак Мішэль.

* * *

Індзейцы, яцвягі, цыганы... Гэтыя прадстаўнікі старых нацый з'явіліся на маёй сцежцы разам з узнікненнем фірмы „Дотык". Цяпер падсылаюць сваіх высланнікаў. Дзень да майго выезду ў Канаду, калі я ішла па беластоцкай вуліцы Юравецкай, я пабачыла індзейца Труса Белая Масць. Яго джынсавы каўнер прыздабляла брошка з каралікаў.

— Пазыч пяць злотых! — кінуў ён, больш з прывычкі чым з патрэбы. — Заўтра аддам.

— Не хвалюйся! — адказала я. — Аддасі ў свой час.

Трус Белая Масць заўсёды пазычае пяць злотых і заўсёды аддае пяць злотых. Такі ў яго індзейскі гонар. Хоць больш за ўсё цаню яго медыумічнасць.

— А я ў сваю *канаду* дую, — пахваліўся як які правакатар, — на важную сустрэчу.

Слова „канада" на мове аднаго з плямёнаў паўночна-ўсходняга ўзбярэжжа Канады абазначае вёску, карацей, „канада" Труса Белая Масць стаіць на паляне ў Кнышынскай пушчы, па дарозе з Беластока ў Гарадок...

Мы развіталіся, але ў гэты дзень „яны" не пакінулі мяне. Дзвесце метраў далей, на існуючым яшчэ базарыку па вуліцы Юравецкай, я наткнулася на музыкантаў з Андаў. Пасярод вясёлага натоўпу, дзе гандлявалі папяросамі і спіртам з Беларусі, іграў і спяваў гурт „Куракас". Высланнікі інкаў, прыздобленыя ў паласатыя понча, прамавалі свой музычны альбом „Anorranzas". Час ад часу ў музыку ўрываўся свойска-базарны заклік: „Wodka! Papierosy! Spirytus!"

Пасля, на лавачцы ў парку імя Тамары Саланевіч, я пачула чарговае прароцтва:

— Każdego dnia będziesz smakować potrawy świata i pić zamorskie wina! — выварожыла мне старая цыганка. Раней я дала ёй пяць злотых і папрасіла, каб памаўчала...

* * *

Мае канадскія гаспадары добра ведаюць Беласток, самым цікавым месцам у ім лічаць згаданы і разбураны ўжо базар па вуліцы Юравецкай. Асабліва падабалася ім як гандлююць у нас спіртам з рукава! Перад ад'ездам у індзейскую рэзервацыю Ада папярэдзіла мяне:

— Напэўна табе не спадабаецца.

— Цікава чаму?

— Бо там як на беластоцкім базары, дзе ні ступіш, сваімі папяросамі накідаюцца.

Праўда, погляд Ады грунтаваўся на іракезскім досведзе. Яна не ўлічыла, што ў гістарычным плане іракезы і гуроны заўзятыя ворагі...

Таксама мой даведнік задбаў, каб я не расчаравалася паездкай у рэзервацыю: „Wielu turystów odwiedzających Kanadę uderza tragizm sytuacji jej pierwotnych mieszkańców. Rezerwaty często są pogrążone w letargu i panuje w nich przerażająca nędza, a w tanich hotelach i obskurnych barach z reguły przesiadują alkoholicy i narkomani. Tubylcze ludy Kanady żyją rozdarte między dwoma światami, w żadnym z nich nie czując się dobrze. Walczą z poczuciem wyobcowania, jakiego nie zna żaden inny Kanadyjczyk".

— Ну, гэта для цябе не сенсацыя, — сказала Ада, — маеш тое ў сваёй вёсцы.

— Я ўжо засумавала па радзіме, — настойвала я.

Раней, чым завіталі ў рэзервацыю, мы яшчэ адведалі дзве цудоўныя сямейкі. Там, як прадказала старая цыганка, частавалі нас стравамі італьянскай кухні і заморскімі вінамі. Калі я выказала сумненні, што брыдка пад хмяльком з'явіцца ў індзейцаў, калега па прафесіі, журналіст Ніколя, жыва запярэчыў:

— Наадварот, — сказаў ён, — яны яшчэ больш вас палюбяць!

(працяг будзе)

Квебек-Сіці: Гуронскі музей у запаведніку, што па вуліцы Станіслава Косткі

30.11 — 06.12

(22.03. — 20.04.) Жыццярадаснасць, запал, баявітасць, адвага. Пераканаеш іншых да свае думкі або намовіш іх да супольнага мерапрыемства. Падгоніш хвасты, справішся з нялёгкімі справамі.

(21.04. — 21.05.) Шчасце, дарабыт, шматлікія ўдачы. Выдатна і ў асабістым жыцці, і ў фінансах. Усё ідзе „як па шнурку". Можаш навучыцца чагосьці, аб чым не меў ніякай уявы. Сваёй інтэлігентнасцю саб'еш з панталыку перш за ўсё начальства.

(22.05. — 22.06.) 3-8.12. могуць нагрувасціцца некаторыя сямейныя і прафесійныя праблемы. Абдумай усе ходы. З 5.12. — фантазія, умеласць адчуць патрэбы іншых. Ідэальны момант на падарожжы і наладжванне новых кантактаў.

(23.06. — 23.07.) Бярыся за рэалізацыю самых важных мерапрыемстваў. Знойдзеш просты шлях у жыцці. У пачуццях разумей іншых, але не дай сябе выкарыстоўваць. Ад блізкіх чакай толькі таго, чаго патрабуеш ад самога сябе. Будзеш неабходны пры лагоджанні канфліктаў і вырашанні складаных спраў.

(24.07. — 23.08.) Мноства энергіі, шмат спраў аформіш хутка і паспяхова, ды не спяшайся! 3-7.12. будзеш незвычайна мужны і ў бескампрамісны спосаб будзеш ісці да мэты. Няўступчывасць — ключ да поспеху. Новае знаёмства — ці ж не тое, што ты сабе прымроіў?

(24.08. — 23.09.) Сямейныя праблемы могуць некарысна адбіцца на тваёй прадуктыўнасці на працы. Старайся не мяшаць асабістых спраў з прафесійнымі. Калі не зробіш першага кроку да асобы, да якой здаўна прыглядаешся, нічога не адбудзецца.

(24.09. — 23.10.) Поспехі ў хатніх і прафесійных справах. Папхнеш справы дапераду, адчуеш моцны павеў у ветразях, адважышся на рэалізацыю нават шалёных задум. З 5.12. пільнуйся, каб не ўлезці ў мерапрыемствы некарысныя для цябе. Можаш тады і пасварыцца за грошы з блізкай асобай.

(24.10. — 22.11.) Адчуеш, як расце ў табе аграмадная энергія, да якой знойдзеш канструктыўны спуск. На працы зробіш вялікае ўражанне. Пакажаш усе магчымасці, якія ў табе дрэмлюць! Карысныя знаёмствы, якія выкарыстаеш для асабістага развою (увесь месяц). Час гучных забаў і гарачых рандэву. Будзеш мець нагоду памяняць кватэру або хоць зрабіць у ёй рамонт.

(23.11. — 22.12.) Асабліва памысная кан'юнкцыя Юпітэра з Венерай! Проста выпраменьваеш шчасце. Пачынаецца для цябе перыяд вялікіх поспехаў! Можаш інвеставаць, шчасце будзеш мець у латарэі (іграй увесь снежань!). Задбай толькі аб свае ныркі — не прастудзі іх, многа пі — і суставы ды косці.

(23.12. — 20.01.) Прадбачваецца вельмі дынамічны месяц. Зоркі прысвечваюць усім тваім дзеянням, дадаюць жыццёвай энергіі і харызмы. З 4.12. праблемы ў кантактах, пачуццё разгубленасці, неспакою, стома ад знясільваючай працы. Пазбягай стрэсаў. Асабліва актыўна правядзеш гэты тыдзень. Можаш раптам расстацца з кімсьці (з тваёй ініцыятывы).

(21.01. — 19.02.) 3-7.12. нервовыя сітуацыі, цяжкасці дагаварыцца з людзьмі, фінансавыя перабоі, унутраны неспакой, складанасці з-за бяздумных высноў. На працы ўсё чакае цябе поспех, аб якім ты марыў. Адкрытасць на эксперыменты, нават і начныя.

(20.02. — 21.03.) Будзеш вельмі чулы на красу другога полу (не нарабі з-за гэтага клопатаў сабе на працы!). 2-6.12. — эмацыянальныя напругі, нервовасць, запальчывасць. Старайся не ўваходзіць у спрэчкі, не паказвай сваёй пагрозлівасці. Лёс спрыяе табе ў рабоце — нават у рызыкоўных кроках.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ПРА ГЕРОЯЎ

Цімафей Хведашчэня — атаман і настаўнік

Алег ЛАТЫШОНАК

Некалькі тыдняў таму я атрымаў ад Уладзіміра Ляхоўскага з Мінска здымак Цімафея Хведашчэні ў „балахоўскім” мундзіры і фуражцы з выявай чэрапа са скрыжаванымі мячамі. Здымак маладога, прыгожага беларускага ваякі безупынна прыцягваў мае вочы, не даваў мне спакою. Я проста мусіў напісаць аб гэтым незвычайным чалавеку, якога помняць яшчэ белавежскія старажылы.

Цімафей Хведашчэня (у некаторых крыніцах — Федасеня) гэта адзін з тысячаў беларусаў, якія цвёрда змагаліся за сваю дзяржаву, але якім лёс не дазволіў ні дасягнуць гэтай мэты, ні наладзіць жыцця на меру сваіх здольнасцей.

Нарадзіўся ён у 1897 г. у вёсцы Заравічы пад Лунінцом. У 1916 г. скончыў шосты клас гімназіі ў Слуцку. У гэтым жа годзе скончыў 6-месячныя афіцэрскія курсы. У наступным годзе быў дэмабілізаваны з Расійскай Арміі, але не кідаў зброі. У снежні 1917 г. быў ужо паручнікам 1-га беларускага пяхотнага палка ў Мінску. Гэты полк фармаваўся з дазволу бальшавіцкага Галоўнакамандуючага Расійскай Арміі Крыленкі, але камандзір Заходняга фронту Мяснікоў загадаў ліквідаваць полк і далучыць яго жаўнераў да 289-га запаснога палка.

Усё-такі перамога бальшавікоў была часовая. Калі немцы, якія не маглі з імі дагаварыцца, рушылі на ўсход, беларускія вайскоўцы 19 лютага паднялі ў Мінску паўстанне і перанялі ўладу ў горадзе. Сярод паўстанцаў быў і Цімох Хведашчэня. 20 лютага беларускія атрады былі спалучаныя ў 1-ы Мінскі Беларускі нацыянальны полк. Паручнік Хведашчэня зацвярджаў палкавыя спісы пячаткаю з выявай Пагоні (зверху) і чэрапа са скрыжаванымі касцямі (унізе). Проста, у той час гэта быў даволі распаўсюджаны сімвал, які абазначаў, што яго носьбіт будзе біцца на смерць, не на жыццё.

На жаль, немцы не згадзіліся на фармаванне беларускай арміі, паколькі думалі аддаць Беларусь бальшавікам. Хведашчэня, відаць, вярнуўся ў родную старонку, бо ў гэтым жа 1918 г. апынуўся ў Пінскім батальёне Белай Арміі. Але ў 1919 г. быў ужо камандзірам батальёна Чырвонай Арміі ў Слуцку. Не адзін ён з выдатных беларускіх вайскоўцаў залічыў стаж у „чырвоных”. Згадаем хаця б камандзіраў чырвоных палкоў Станіслава Булак-Балаховіча і Вячаслава Адамовіча-старэйшага, ці бальшавіцкага камісара Міколу Дзямідава.

Паручнік Цімафей Хведашчэня. 1920 г.

Падчас польскага наступлення на Беларусі на тылах савецкіх войск выступілі збройна беларускія вайскоўцы. На бок палякаў перайшоў тады згаданы ўжо Адамовіч-старэйшы, камандзір Полацкага палка. Антыбальшавіцкі рокаш у сваім батальёне падняў і Хведашчэня, які далучыўся да 1-га беларускага партызанцкага атрада пад камандаваннем Лукаша Сяменіка. Капітан Сяменік арганізаваў паўстанне на тэрыторыі Барысаўшчыны. Выціснуты бальшавіцкай карнай экспедыцыяй, схаваўся ў лясах. Калі польскія войскі падышлі пад Барысаў, паразумеўся з іх камандаваннем і вывеў свой атрад разам з польскім 3-м уланскім палком на тылы бальшавікоў, што паскорыла іх адыход з Барысава. Атрад Сяменіка застаўся пасля на фронце да лістапада 1919 г.

Хведашчэня з ліпеня 1919 да лета 1920 г. служыў у Войску Польскім як супрацоўнік 2-а аддзела (выведка і контрвыведка) пры камандаванні 2-й дывізіі (пазней 6-й дывізіі).

Увосень 1920 г. Хведашчэня як камандзір групы мінскіх партызанскіх атрадаў падпісаў разам з В. Адамовічам-старэйшым, старшынёй Беларускага палітычнага камітэта і, між іншым, Паўлам Алексюком, тэлеграму на адрас старшыні Расійскага палітычнага камітэта Барыса Савінкава і генерала Станіслава Булак-Балаховіча: „Пакутуя пад ігам захопнікаў-бальшавікоў беларускі народ кліча дапамагчы яму вызваліцца і здзейсніць запаветную мару многіх пакаленняў аб самастойнай дэмакратычнай Беларусі”. 12 кастрычніка БПК заключыў дамову з Булак-Балаховічам, у якой забавязаўся памагчы генералу ў арганізацыі беларускай арміі, а гэты ўзамен меў перадаць БПК цывільную ўладу на занятай сабой тэрыторыі Беларусі.

У другой палове кастрычніка Хведашчэня з'явіўся ў Слуцку, дзе вербаваў добраахвотнікаў у армію ген. Булак-Балаховіча. На пачатку лістапада 1920 г. Хведашчэня прывёў у лагер Балаховіча атрад, які прадстаўляўся „імпазантна з увагі на мараль і дысцыпліну” і нічым не розніўся ад рэгулярных атрадаў. Меў свой сцяг і нават невялікі аркестр. Атрад капітана Хведашчэні далучаны быў як Асобны Беларускі батальён (разам з кавалерыйскім узводам налічваў 700 людзей) да 2-й Мінскай дывізіі пад камандаваннем палкоўніка Медарда Мікошы.

Падчас паходу генерала Булак-Балаховіча група палкоўніка Мікошы дзейнічала на левым флангу арміі з мэтай узяць Жлобін. 10 лістапада вырушыла з Петрыкава і 14 таго ж месяца ўзяла Калінкавічы, дзень пазней накіроўваючыся на Жлобін. 16 лістапада бальшавікі затрымалі наступ палкоўніка Мікошы пад Дамановічамі і наступнага дня прымусілі яго адступаць да Мазыра. Ноччу з 17 на 18 лістапада атрады палкоўніка Мікошы і расійскія атрады ген. Яраслаўцава пакінулі Мазыр і падаліся ў нейтральную зону. Пад канец месяца былі інтэрнаваныя разам з цэлай арміяй.

Капітан Хведашчэня належаў да тых, якія, падобна Міколу Дзямідаву з беластоцкім батальёнам, вырашылі не здавацца. Спярша са сваім атрадам падаўся ў Слуцк, дзе выступаў як камандзір Мінскага аддзела народнай дабраахвотніцкай арміі. Варожа прыняты эсэраўскім кіраўніцтвам Рады Случчыны, накіраваўся ў Вызну, дзе быццам бы зрабіў пагром і пагражаў рабіну шыбеніцай, калі не будзе аддадзены вялікі выкуп, але мусіў скрыцца ад случчакоў. На канец, калі трэба было біцца з бальшавікамі, Хведашчэня ўсё-такі стаў афіцэрам 1-й Слуцкай брыгады.

Пасля таго, як брыгада закончыла баявыя дзеянні і была інтэрнаваная палякамі, Хведашчэня быў сярод тых случчакоў, якія не хацелі здацца. Ян Пешка „Густалес” даў саветам паказанні, што Хведашчэня разам з прыхільнікамі генерала Булак-Балаховіча: Арсенем Паўлюкевічам і паручнікам Мацелі, але таксама ў нечаканай кампаніі капітана Антона Борыка, які быў супрацоўнікам генерала, але можа памя-

няў погляд, калі быў адхілены ад пасады шэфа штаба Слуцкай брыгады ды групай моладзі, сярод якой быў м.інш. Сяргей Бусел, адступіў з Морача, апошняга апорнага пункта случчакоў, у Давыд-Гарадок. Там случчакоў і балахоўцаў, якія да іх далучыліся, абяззброілі палякі. Тым не менш Арсень Паўлюкевіч выступіў з прамовай, у якой гаварыў, што беларускія жаўнеры вызваляць Беларусь ад палякаў і беларусаў. Пасля накіравалі іх у Лунінец.

У Лунінцы памяшчаўся галоўны штаб атрадаў Сялянскай партыі „Зялёнага Дуба", створанай Адамовічам-старэйшым, якая ўвосень папярэдняга года падтрымала генерала Булак-Балаховіча. Камандзірам збройных атрадаў „Зялёнага Дуба" быў атаман Вячаслаў Адамовіч-малодшы (псеўданім „Дзяргач"). Адным з атаманаў „Зялёнага Дуба" стаў таксама Хведашчэня (псеўданім „Вішнеўскі"; карыстаўся таксама псеўданімам „Кулеўскі").

Каля двух з паловай тысяч случчакоў, якія не хацелі паддацца інтэрнаванню, стаялі ў наваколлі Нясвіжа. Тут прыбыла таксама частка жаўнераў з батальёна Дзямідава і наплывалі беларускія дэзерціры з Чырвонай Арміі. Тут стаў дзейнічаць і Хведашчэня, які 27 снежня 1920 г. абвясціўся атаманам беларускіх партызанскіх атрадаў.

На пачатку 1921 г. колькасць беларускіх жаўнераў, якія канцэнтраваліся ў наваколлі Нясвіжа, ацэньвалася на 4 тысячы. Шмат хто з іх захаваў зброю. Гэтую масу беларускіх вайскоўцаў прабавала арганізаваць польскае камандаванне, ствараючы з іх г.зв. работніцкія дружыны. Яны займаліся адбудовай мастоў, рамонтам дарог і г.п. працамі ў прыфрантавой зоне. У пік разбудовы яны налічвалі паўтары тысячы людзей. Гэтыя дружыны служылі базай для фармавання з самых надзейных і антыбальшавіцка настроеных асоб дыверсійных груп, якіх перакідалі на савецкі бок. У лютым 1921 г. камандзірам гэтых дружын быў Хведашчэня.

Вясной 1921 года польскае камандаванне вырашыла распусціць беларускія атрады, аб чым было даведзена да ведама іх камандзірам ужо на пачатку красавіка. Свядомасць таго, што вайна скончылася, безумоўна паўплывала на маральны стан беларускіх партызанаў. Частка з іх стала марадзёрамі. Яшчэ на пачатку красавіка капітан Хведашчэня і яго памочнікі ацэньваліся палякамі як добрыя партызаны, якія толькі не ўмеюць навесці дысцыпліну сярод сваіх людзей. Адзін з падпарадкаваных Хведашчэню атрадаў, пасланы на Слуцк, зараз за мяжой напаў на рэўкам у Магільне і пад Пясочнай, забіваючы прытым пяць невінаватых асоб. Марадзёры абнаглелі да такой ступені, што сталі рабіць напады і на польскім баку. У сярэдзіне красавіка польскае і беларускае камандаванне мусіла арганізаваць адмысловую акцыю, каб злавіць марадзёраў з атрада Хведашчэні. Як здаецца, пры нагодзе арыштаваны быў і сам Хведашчэня, паколькі беларускае камандаванне прасіла польскі бок, каб яго не выпускаць, баючыся помсты. Марадзёры перададзены былі атаману Адамовічу „Дзергачу" „дзеля расправы кароткім шляхам".

Ці па гэтай прычыне, ці ў выніку проста змагання за кіраўніцтва над партызанскім рухам, якога фрагментам магло быць арыштаванне Хведашчэні, той парваў з „Зялёным Дубам" і „Дзергачом" асабіста. Звязаўся бліжэй з генералам Булак-Балаховічам і Паўлам Алексюком і ад іх імя 10 чэрвеня 1921 падаўся на тэрыторыю Савецкай Беларусі і пачаў арганізаваць падполле на тэрыторыі Бабруйскага і Слуцкага паветаў. Прызваў у пакрытыя лесам Вараб'евы горы сваіх колішніх жаўнераў і зялёнадубцаў, за якімі пацягнуліся і дэзерціры з Чырвонай Арміі. Падзяліў іх на чатыры атрады па дзвесце пяцьдзесят чалавек пад камандаваннем сваіх афіцэраў. Хутка стварыў сетку інфарматараў па вёсках і арганізаваў пяцёркі, якія распаўсюджвалі літаратуру і вялі агітацыю сярод сялян і жаўнераў Чырвонай Арміі, ды займаліся разведкай. Блізка супрацоўнічаў з паручнікам Караткевічам, які тады парваў з „Дзергачом" і падпарадкаваўся Булак-Балаховічу і сабраў пад сваім камандаваннем усе паўстанцкія групы ў Мазырскім павеце. Хведашчэня ўзяў прыклад з Караткевіча і арганізаваў тэрарыстычныя групы, каб ачысціць свой раён ад камуністаў, арганізоўваючы напады на рэўкамы і на адзінкі ў вялікіх цэнтрах Беларусі. Навязаў таксама кантакт з паручнікам Монічам і капітанам Сяменікам, якія партызанілі ў Барысаўскім павеце і з паўстанцкай арганізацыяй на Ігуменшчыне, на чале якой стаяў Міхась Жылінскі, афіцыйна ваенком і начальнік Ігуменскага гарнізона, а ў сапраўднасці сябра „Зялёнага Дуба". Сродкі на пражыванне „атаман Кулеўскі" здабываў, робячы напады на рэквізіцыйныя атрады (г.зв. продразвёрсткі) і рэўкамы, дзе здабываў грошы на пакупку прадуктаў. Арганізаваў між іншым напад на бальшавіцкі аддзел каля вёскі Вялікі Ражан.

Хведашчэня не прабываў доўга на Савецкай Беларусі, магчыма толькі да 29 чэрвеня. Пасля вяртання звязаўся з арганізацыяй Народны хаўрус „За Бацькаўшчыну", створаную случчаком Арсенем Паўлюкевічам летам 1921 г., якая за мэту ставіла сабе „вызваленне Бацькаўшчыны з рук камуністаў, утварэнне Незалежнай Непадзельнай Беларусі ў яе этнаграфічных межах". Штаб Паўлюкевіча стварыў партызанскія атрады, на чале якіх стаяў Хведашчэня.

У кастрычніку 1921 г. атаман быў арыштаваны 2-м аддзелам 2-й арміі Войска Польскага ў мясцовасці Морач па абвінавачанні ў службовых і фінансавых злоўжываннях, але 24 снежня вызвалены быў з-пад варты ў Берасці. Няясна, чым быў выкліканы сапраўды гэты арышт, бо арганізацыя „За Бацькаўшчыну" стала пераходзіць на антыпольскія пазіцыі. Наглядаючы здзек польскіх улад над беларушчынай, Арсень Паўлюкевіч прыйшоў да высновы, што лепш ужо далучыцца да Расіі, чым цярпець польскае ярмо. Гэта завяло яго ў 1922 г. у польскую турму.

У ліпені 1923 г. Камендатура Палітычнай паліцыі на г. Вільню зрабіла свайго роду верыфікацыю беларускіх дзеячаў і палічыла Хведашчэню прапольска настаўленым беларускім вайскоўцам, які жыў ужо ў Белавежы. Атаман папаў сюды відаць разам з сотнямі іншых балахоўцаў, паселеных

працяг ☞ III

З'езд балахоўцаў у Белавежы ў 1927 г.

Довѣренность. № 30

Я нижеподписавшійся, Комендантъ Беларускихъ партизанскихъ отрядовъ поручикъ Хведощенъ, получилъ деньги в суммѣ 1.102.884 марки 80 пф. (одинъ милліонъ сто двѣ тысячи восемьсотъ четыре марки 80 пф.) на ликвидацію Минскаго партизанскаго отряда отъ Гродненскаго эвакуаціоннаго Комитета в Польшѣ (особая Комиссія Управленія по дѣламъ интернированныхъ в Каменцѣ) Довѣренность выдана Адъютанту Беларусскихъ партизанскихъ отрядовъ Курнекольскому. Антонь 10 іюня 1921 г.

Атаман партызанскіх атрадаў

Хведашчэня

Пячатка атамана Хведашчэні. 1921 г.

Беларускія настаўнікі Беласточчыны. Цімафей Хведашчэня — у першым радзе першы злева. 1943 г.

Родам з Беласточчыны

Вашкевіч Аляксандр

Беларускі генерал з Беласточчыны

Сяргей ЧЫГРЫН

Генерал з Беласточчыны — Аляксандр Вашкевіч — асоба вядомая і мужная. Нарадзіўся ён 11 ліпеня (па іншых звестках 28 жніўня) 1901 года ў Белавежы ў беларускай сялянскай сям'і. Паспеў дома яшчэ навучыцца чытаць і пісаць. Бо калі хлопчыку споўнілася 13 гадоў, яго бацькі, разам з васьмю малодшымі сёстрамі і братамі, пакінулі родную Белавежу і падаліся ў бежанства. Іх сям'ю дарогі прывялі ажно на Урал у горад Чэлябінск. Але там шчасця не было. Ад нялёгкага жыцця Аляксандр Вашкевіч у 1918 годзе дабраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію і быў накіраваны ў саставе 237 Мінскага пяхотнага палка на Заходні фронт. А ў 1920 годзе нашага земляка прынялі ў падафіцэрскую школу, а пасля — у Смаленскую афіцэрскую школу, якую ён скончыў праз пяць гадоў. Пасля заканчэння школы, малады беларускі афіцэр Вашкевіч служыў камандзірам узвода, а пасля даслужыўся ажно да начальніка штаба 211 пяхотнага палка 71 дывізіі Чырвонай Арміі. У 1938 годзе Аляксандр Вашкевіч скончыў Ваенную Акадэмію імя Фрунзе ў Маскве і ў гэтай акадэміі атрымаў пасаду начальніка аддзела навучання. Такім чынам прайшоў ён усе ступені салдацкага лёсу. Таму добра разумеў салдат і маладых афіцэраў і сярод іх заўсёды найлепш адчуваў сябе, карыстаючыся аўтарытэтам. Аднак хутка педагагічна-навуковую дзейнасць падпалкоўніка Вашкевіча спыніла Другая сусветная вайна. У студзені 1942 года яго прызначаюць камандзірам палка, а потым намеснікам камандзіра 116 пяхотнай дывізіі. І першую баявую закалку ён атрымлівае ў 1943 годзе пад Курскам. За гэта яго ўзнагароджваюць ордэнам Чырвонага Сцяга. А летам 1943 года вызначыўся ён ў пераправе праз Днепр. Пад вёскай Перавалочная недалёка ад Днепрапятроўска яму першаму ўдалося адбіць у немцаў кавалак зямлі на заходнім беразе Дняпра. Пакуль паспелі галоўныя сілы арміі, пад камандаваннем Вашкевіча засталося ў жывых усяго 13 салдат. Так пісаў у сваёй кнізе „Генерал Аляксандр Вашкевіч, 1901-1945" польскі гісторык Ян Лемпкоўскі. Кніга пабачыла свет у 1976 годзе ў выдавецтве Міністэрства нацыянальнай абароны Польскай Народнай Рэспублікі. А вось пра гэты факт беларуская энцыклапедыя „Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945" (Мінск 1990, с. 118) падае інакш: „Камандзір стралковага палка падпалкоўнік Вашкевіч вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра. У ноч на 27 верасня 1943 года ўмела арганізаваў пераправу палка каля вёскі Перавалочная Кішэнькаўскага раёна Палтаўскай вобласці; без страт у жывой сіле і тэхніцы полк замацаваўся на плацдарме і паспяхова працягваў наступленне". Цяжка сказаць, як там і што было, але за гэты ўчынак Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў Аляксандру Вашкевічу (ужо палкоўніку) званне Героя Савецкага Саюза і ўзнагародзіў яго Залатой Зоркай Героя і ордэнам Леніна.

Беларускі вайсковец, генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся 28 жніўня 1901 года ў Белавежы Гайнаўскага павета Падляшскага ваяводства. Скончыў кулямётную і пяхотную школы, удзельнік Другой сусветнай вайны. Загінуў у час Берлінскай аперацыі 22 красавіка 1945 года. Пахаваны ў Варшаве

З верасня 1944 года ваюе з белавежскага роду хлопец у складзе Другой Арміі Войска Польскага. Ён камандуе пяхотнай дывізіяй і атрымлівае званне генерала брыгады. Са сваёй дывізіяй беларускі генерал ідзе на Берлін праз Варшаву, Лодзь і Познань і трапляе на фронт на Нысе Лужыцкай, а пасля ў раён Баўтцэна (Будзішына) і Дрэздэна. Там спасцігае і яго смерць. Лекарская камісія тады пацвердзіла, што генерала Вашкевіча немцы схапілі параненым і моцна над ім здзекаваліся. Прычынай гэтаму было тое, што штаб Вашкевіча адстаў ад асноўных сіл Савецкай Арміі і Войска Польскага і трапіў у акружэнне немцаў, якія прабіваліся на дапамогу Берліну...

Беларускі генерал з Белавежы Аляксандр Вашкевіч пасмяротна быў узнагароджаны крыжом Віртуці Мілітары і ордэнам Адраджэння Польшчы. Ён пахаваны ў Варшаве ў Алеі Заслужаных. У роднай Белавежы ў ягоны гонар названа галоўная вуліца гэтага гміннага зараз пасёлка. У непадалёкіх ад мяжы Пружанах, што ў Брэсцкай вобласці, яго імя прысвоена адной з гарадскіх вуліц. Горшы лёс сустрэў назву вуліцы з ягоным імем у Бельску-Падляшскім. На пачатку 1990-х гадоў гарадскія дэпутаты перайменавалі яе ў вуліцу генерала Францішка Клеберга, які ў верасні 1939 г. змагаўся з немцамі, камандуючы асобнай аператыўнай групай „Палессе".

II ☞працяг тут сваім камандзірам.

Як успамінае белавежац Георгі Валкавыцкі, Хведашчэня „ажаніўся з тутэйшай жанчынай, мусіць з Валкавыцкіх, якіх называлі Цярэнцьевымі, ад бацькі Цярэнція. Жыў на жончыным, на Заставе (цяпер вул. Вольгі Габец). Мужчына быў вельмі высокі, мажны, мусіць самы моцны на Заставе. Да Другой сусветнай вайны абуваў белавежцаў у гумовыя лапці — прадаваў матацыклавыя і самаходавыя шыны, з якіх рабілі лапці, у параўнанні з традыцыйнымі — вечныя".

У 1926 г. да ўлады ў Польшчы ў выніку збройнага перавароту прыйшоў Юзаф Пілсудскі. Паколькі немалую дапамогу ў тым аказаў яму генерал Булак-Балаховіч, які са сваімі людзьмі перарэзаў дарогу ўцёкаў ураду прэм'ер-міністра Вітаса, сталі ўшаноўваць як Генерала, так і яго жаўнераў. У 1927 г. у Белавежы адбыўся з'езд балахоўцаў. 11 лістапада 1928 г. Хведашчэня быў удастоены медаля „Польшча свайму абаронцу". У студзені 1939 г. звярнуўся да Міністэрства вайсковых спраў з просьбай разгледзець яго заяву ў справе ўзнагароджання Крыжам Незалежнасці. У гэты час жыў у Гайнаўцы.

У 1939-1941 гг. настаўнічаў у Белавежы.

Падчас нямецкай акупацыі стаў старшынёй філіяла Беларускага аб'яднання ў Белавежы, якое налічвала тут 84 чалавекі.

Белавежскія школьнікі і настаўнікі. 1942 або 1943 г. У цэнтры — Цімафей Хведашчэня

Як упамінае Г. Валкавыцкі, „арганізаваў беларускую школу і стаў яе кіраўніком. Займаўся таксама культурнай дзейнасцю. У 1942 г. сцягнуў на канцэрт Забэйду-Суміцкага, які ў яго начаваў падчас побыту ў Белавежы. Хведашчэні належала таксама крама з пісьмовымі матэрыяламі і газетамі, у якой таргавала старэйшая дачка — Тамара. Крама стаяла там, дзе і іншыя, як гэта называлі белавежцы — буткі, у радзе перад кіно, дзе цяпер Дом культуры. Можна было ў ёй купіць беларускія газеты, беластоцкую „Новую Дарогу" і берлінскую „Раніцу". Калі ў 1943 г. вывозілі на работу ў Прусію рочнікі 1923 і 1924, узялі і Тамару. Да Бельска мы ехалі разам, бо мяне таксама ўзялі, праводзіла яе і малодшая сястра, але адтуль яе бацька здолеў вярнуць, наладзіўшы нейк справу з немцамі.

Пад канец вайны, у 1944 г., разам з сям'ёй выехаў з немцамі.

Пасля вайны нейкім чынам стаў палкоўнікам Войска Польскага і служыў у авіяцыі. Дачка Тамара вучылася ў 1947 г. у Акадэміі палітычных навук на факультэце журналістыкі. Але нехта выдаў яго, ягоную сапраўдную тоеснасць, і Хведашчэня папаў у турму.

Апошні раз я бачыў Хведашчэню пад канец жніўня 1954 г. у Варшаве. Я выйшаў з Міністэрства вышэйшай асветы, якое памяшчаецца па вул. Мядовай. На Кракаўскім Прадмесці пабачыў, што насупраць мяне ідзе высокі, мажны мужчына ў мундзіры без пагонаў. Ішоў з апушчанай галавой. Толькі калі мы прайшлі міма сябе, я сцяміў, што гэта быў Хведашчэня, але я яго не зачапіў. Магчыма, якраз тады яго і адпусцілі з турмы".

Памёр Цімафей Хведашчэня напрыканцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў.

*Аўтар дзякуе Юры Грыбоўскаму за перададзеныя звесткі і здымкі, а Пятру Байко за інфармацыі. У артыкуле скарыстаныя звесткі, сабраныя аўтарам у працы „Беларускія вайсковыя фармаванні 1917-1923" (Беласток 1995) і матэрыялы, апублікаваныя Іааннай Янушэўскай-Юркевіч у „Беларускім гістарычным зборніку" („Raport atamana Chwiedoszczeni...", „Białoruskie Zeszyty Historyczne", t. 14, 2000 і „Przyczynek do losów przywódców „Zielonego Dębu"...", „BZH", t. 15, 2001), кніжка Ніны Стужынскй „Беларусь мяцежная" (Вільня 2000), а таксама расказ Георгія Валкавыцкага, запісаны аўтарам 14 лістапада 2008 г., дапоўнены звесткамі з расказу запісанага Пятром Байко 2.08.2001 г.

Беларуская кавалерыя ў III Шлёнскім паўстанні

Алег ЛАТЫШОНАК

Памеры беларускага збройнага чыну ў часы змагання за незалежную БНР збольшага ўжо вывучаны. Усё-такі лёсы ўдзельнікаў гэтага змагання вартыя глыбейшага вывучэння. Да такіх малавядомых эпізодаў у гісторыі беларускай вайсковай справы належыць удзел беларусаў у Трэцім Шлёнскім паўстанні.

Паўстанне выбухла ноччу з 2 на 3 мая 1921 г. пад пагрозай далучэння большай часткі Сілезіі да Нямеччыны ў выніку плебісцыту. Міжсаюзніцкая камісія, якая прадстаўляла інтарэсы пераможных у Першай сусветнай вайне магутных дзяржаў, прызнала немцам амаль тры чвэрці тэрыторыі, на якой адбыўся плебісцыт. Паўстанне папярэдзіла генеральная забастоўка, якая 2 мая абняла 97% шлёнскіх прадпрыемстваў. Ноччу паўстанцы ўзарвалі чыгуначныя масты на Одры, перарэзваючы чыгуначныя спалучэнні з Нямеччынай. Паўстанцы занялі амаль увесь плебісцытны абшар. На чале паўстання як дыктатар стаў Войцех Карфанты, а галоўнакамандуючым стаў палкоўнік Войска Польскага Мацей Мяльжынскі. Фронт і паўстанцкія войскі падзеленыя былі на чатыры групы: „Усход", з якой пасля выдзеленая была група „Цэнтр", „Поўдзень" і „Поўнач". Нас цікавіць менавіта гэтая апошняя.

Сустрэча камандзіраў і ўдзельнікаў Трэцяга Шлёнскага паўстання ў 10-ю гадавіну выбуху (май 1931). Сядзяць у першым радзе справа: трэці — ген. Станіслаў Булак-Балаховіч, пяты — Мацей Мяльжынскі, шосты — ваявода шлёнскі Міхал Гражынскі.

Задачай Паўночнай групы, якая налічвала каля 10 тысяч паўстанцаў, было ўтрымаць у руках паўстанцаў абшар трох паветаў: Алескага, Люблінецкага і Стшэлецкага ды ад поўначы перакрыць немцам шлях у прамысловую акругу. Ключавымі пунктамі былі Алесна, Дабродзень, Фасоўскае і Стшэльцы-Апольскія. Камандзірам групы быў капітан Алёйзы Новак (псеўд. „Нойгебаўэр"), начальнікам штаба — Ян Выгленда „Траўгут". Кватэра штаба памяшчалася ў Тварогу. Група падзялялася на падгрупы. Падгрупа „Богдан" ваявала ў Стшэлецкім павеце. Яе пазіцыі абапіраліся левым крылом на Одры, у цэнтры атачаючы Гаголін, а далей на ўсход да Гродзіска. Адрэзак падгрупы „Лінкэ" распасціраўся ад сутыкнення з групай „Богдан" праз Малыя Станішчы, Мысліну да вакзала ў Зэмбавіцах і Шумірадзе. Аграмадныя лясныя абшары разбівалі фронт падгрупы „Лінкэ" на два адрэзкі, паміж якімі пралягала чыгуначная лінія Фасоўскае — Ключбарк. Падгрупа „Бутрым" займала адрэзак на захад ад Вяндрыні і Старога Алесна, а далей на захад ад чыгуначнай лініі Алесна — Гожуў да польскай мяжы.

Паміж падгрупамі „Лінкэ" і „Бутрым" ляжаў непразрысты лясны пояс шырынёй у некалькі кіламетраў, якім немцы маглі перабрацца на тылы паўстанцаў. Каб прадухіліць пагрозу, камандаванне Групы „Поўнач" сфармавала эскадрон кавалерыі. Неўзабаве паўстанцкую кавалерыю папоўнілі тры эскадроны беларусаў, якія прыбылі з лагера інтэрнаваных пад Чэнстаховай. Гэта былі жаўнеры ген. Станіслава Булак-Балаховіча, відавочна інтэрнаваныя ў Страдаме (цяпер квартал Чэнстаховы). Паўстанцкая група „Поўнач" паслала ў Чэнстахову свайго прадстаўніка, сувязнога афіцэра паручніка Яна Грая, яшчэ на некалькі дзён да выбуху паўстання. Грай вельмі добра спраўляўся са сваімі абавязкамі, карыстаючыся сімпатыяй ген. Дамбкоўскага, камандзіра чэнстахоўскай дывізіі. Група „Поўнач" атрымала істотную дапамогу ў вінтоўках, кулямётах, а перш за ўсё ў амуніцыі. Дамбкоўскі нават дазволіў Граю „выкрасці" адну палявую батарэю. Паручнік Грай займаўся таксама вярбоўкай добраахвотнікаў, якіх праз ягоны пункт прайшло больш за пяцьсот. Грай наладзіў і пераход добраахвотнікаў ад беларускага генерала Булак-Балаховіча.

Разам з прыходам беларусаў кавалерыя Паўночнай групы ўзрасла да чатырох эскадронаў пад камандаваннем падпаручніка Юзафа Езёрскага, які апрача таго быў і каменданта жандармерыі Групы. Яго ад'ютантам быў падпаручнік Браніслаў Яноўскі. Кавалерыя ўтрымлівала сувязь між падгрупамі „Бутрым" і „Лінкэ". Коннікі добра выканалі сваю задачу, патрулюючы дзень і ноч абшары ключбаркска-дабродзеньскіх лясоў, праводзячы незлічоныя сутычкі з патрулямі нямецкага Зэльбстшуцу. Такім чынам забяспечваліся флангі абедзвюх паўстанцкіх падгруп.

Становішча на фронце пагоршылася пад канец мая. Немцы безупынна атакавалі Зэмбавіцэ — Дабродзень. Паўстанцкія часткі адступілі на поўнач ад высунутага прыпынку Камянец. Паколькі адначасова пярэднія пасты падгрупы „Бутрым", якія стаялі ў Худобе і Вяндрыні, мусілі пакінуць пазіцыі, сувязь між падрупамі „Лінкэ" і „Бутрым" была сарвана. З гэтага моманту забеспячэнне флангаў абедзвюх падгруп пала на плечы конніцы.

Кавалерыя ўдзельнічала таксама ў змаганні на фронце. 12 чэрвеня прыйшло да сутыкненняў на поўдзень ад Алесна. Паўстанцы адкінулі наступ батальёнаў „Росбах" і „Карыюс" і самі ўзялі Ваховіцы і Лясную. Да перамогі спрычынілася паўстанцкая кавалерыя, якая здабыла адзін кулямёт і шэсць ручных кулямётаў падчас атакі на цагельню Ваховіцы. У бітве паўстанцы страцілі 13 чалавек забітымі і каля трыццаці раненымі.

У чэрвені ваюючыя бакі былі раздзелены кардонам французскіх і італьянскіх войскаў. 5 ліпеня заключанае было перамір'е. Усе вайсковыя фармаванні мусілі выйсці з плебісцытнай тэрыторыі. Паўстанцы перайшлі польскую мяжу і былі інтэрнаваныя. 12 кастрычніка Ліга Нацый прыняла рашэнне аб больш карысным для Польшчы падзеле Верхняй Сілезіі, адобранае неўзабаве Радай Паслоў. На канец Міжсаюзніцкая камісія прыняла карысныя для Польшчы рашэнні. Прызнаны Польшчы абшар быў пабольшаны да каля адной трэці спрэчнай тэрыторыі. Польшча атрымала 50% металургічных заводаў і 76% шахтаў, што мела надзвычайна вялікае значэнне для яе эканомікі. З пункту гледжання польскай дзяржавы мэта паўстання ў прынцыпе была дасягнута.

Іншай думкі былі самі паўстанцы. Больш за тры тысячы паўстанцаў з Паўночнай групы пад камандаваннем Яна Выгленды апынулася ў казармах у Яраціне ў Велькапольшчы. Большасць з іх паходзіла з тэрыторыі, якую яны абаранілі ў крывавых бітвах, а якая цяпер адыходзіла да Нямеччыны. Гэта значыла, што яны не змогуць вярнуцца дахаты. Паўстанцы не хацелі здаць зброі, бо ўважалі, што змаганне за Шлёнск яшчэ не закончылася. Пад канец ліпеня школа падхарунжых у Сярэме атачыла яраціньскія казармы, каб узяць іх штурмам і такім чынам абяззброіць паўстанцаў. Камандзір лагера паўстанцаў ледзь умаліў сваіх жаўнераў, каб дабравольна здалі зброю. У Інаўроцлаве, дзе апынулася таксама група паўстанцаў з Апольшчыны, іх абяззбройванне не абышлося без кровапраліцця. Было там некалькі забітых і раненых.

Невядома, на жаль, што сталася з беларускімі жаўнерамі, якім другі раз давялося спазнаць горыч інтэрнавання. Можа калісьці дачакаюцца ўшанавання.

*На падставе: Jan Wyglenda „Traugutt", *Plebiscyt i powstania śląskie*, Opole 1966; *Encyklopedia powstań śląskich*, Opole 1982; *III powstanie śląskie* [online]. Wikipedia: wolna encyklopedia, 2008-11-3 15:21Z [dostęp: 2008-11-17 19:03Z]. Dostępny w Internecie: http://pl.wikipedia.org/w/index.php?title=III_powstanie_%C5%9Bl%C4%85skie&oldid=14696521